

БОЛЬШ ЧЫМ СЯСТРА І СЯДЗЕЛКА 5

ДЗЕ КУПЛЯЦЬ САМЫ НАРОДНЫ ПРАДУКТ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 СНЕЖНЯ 2020 г. СУБОТА № 238 (29352)

## КОРАТКА

- Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася са студэнтамі факультэта журналістыкі БДУ.
- **Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль Ісачанка 5 снежня правядзе прамую тэлефонную лінію ў новым фармаце.**
- Расійска-беларускія вучэнні «Захад-2021» пройдуць у верасні.
- **Кіпр адкрые мяжу для беларусаў 1 сакавіка.**
- Навукова-вытворчы ўчастак лазерных тэхналогій і арт-аб'ект «Граніт навукі» адкрыюць у Нацыянальнай акадэміі навук 9 снежня.
- **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Талін да 31 снежня.**
- ПЛР-лабараторыя адкрылася ў Ваўкавыску.
- **Музейную экспазіцыю ствараюць у Пятым форце Брэсцкай крэпасці.**



- Каля 100 «Ёлак жаданняў» установіць Чырвоны Крыж у Гомельскай вобласці.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Самае галоўнае — захаваць жыццё чалавеку»

### Агляд перадавой барацьбы з ковідам у рэгіёнах Прэзідэнт Беларусі пачаў з Віцебшчыны

**У пачатку пандэміі паўночна-ўсходні рэгіён Беларусі разам са сталіцай аказаўся ў «лідарах» па колькасці хворых на каранавірус. Два гэтыя гарады першымі прынялі самы моцны ўдар «кароны», хутчэй за іншыя выйшлі на плато і пайшлі на спад па захваральнасці. Сёння сітуацыя на Віцебшчыне з COVID-19 кантралюемая. Хворыя забяспечаны ложка-месцамі і лекавымі прэпаратамі, бальніцы — медыцынскім персаналам, а ўрачы — сродкамі індывідуальнай аховы. Прынамсі, у гэтым Прэзідэнта падчас яго візіту ў Віцебск запэўніў кіраўнік абласнога штаба па супрацьдзеянні распаўсюджанню COVID-19, старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў.**

**Прэзідэнт наведаў Віцебскі абласны клінічны радзільны дом. Там кіраўніку дзяржавы далажылі аб дзейнасці гэтай установы аховы здароўя і яе рабоце ва ўмовах COVID-19. Пасля радзільні Прэзідэнт прыехаў у аблвыканкам, каб прыняць удзел у пасяджэнні абласнога штаба па пытаннях супрацьдзеяння каранавіруснай інфекцыі ў рэгіёне.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

Мітрапаліт Веньямін:

# «Нам усім неабходна прасіць у Бога мудрасці і разважлівасці»



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Тры месяцы таму Беларускую праваслаўную царкву ўзначаліў мітрапаліт Веньямін (Тупека), чалавек для нашай краіны родны і вядомы. Гэта прызначэнне адбылося ў няпросты час як для беларускага грамадства, так і для чалавецтва ў цэлым, бо, напэўна, сёлета трывогі датычацца кожнага чалавека на Зямлі. Патрыяршы экзарх пагадзіўся адказаць на пытанні журналіста «Звязды» наконт гэтых трох месяцаў і падзяліўся сваімі думкамі пра асаблівасці і сапраўдную небяспеку сённяшняга часу.**

СТАР. 4-5



Рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта доктар тэхнічных навук, дацэнт Сяргей ХАРЫТОНЧЫК.

З нагоды юбілею

# БНТУ СПАЎНЯЕЦЦА 100 ГАДОЎ

## ВНУ, розумам і працай выпускнікоў якой у многім пабудавана сучасная Беларусь



**Сто гадоў для навучальнай установы — нямала. Падчас такой значнай даты, як правіла, хочацца падвесці пэўныя вынікі: чаго дасягнулі за гэты час? У якім кірунку рухацца далей? Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт дакладна ведае адказы на гэтыя пытанні: за ўвесь перыяд яго гісторыі тут падрыхтавалі больш за 220 тысяч спецыялістаў. На сёння ў ВНУ навучаецца каля 35 тысяч студэнтаў. Падрыхтоўку інжынерных кадраў па 140 спецыяльнасцях і спецыялізацыях вядуць 91 кафедра і 97 іх філіялаў. Напярэдадні святочных дзён разам з рэктарам універсітэта Сяргеем ХАРЫТОНЧЫКАМ абмеркавалі надыходзячыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да юбілею, акунуліся ў гісторыю альма-матар, паразмаўлялі аб традыцыях, новых тэхналогіях у навучанні і многім іншым.**

— Для нас гэта вельмі значная дата: трэба азірнуцца і ацаніць усю папярэднюю работу, кірунак, у якім мы рухаліся дагэтуль, — кажа Сяргей Васілевіч. — Думаю, многія пагодзяцца з тым, што сучасная Беларусь шмат у чым пабудавана розумам і працай выпускнікоў нашага ўніверсітэта. Яны праектуюць будынкі, узводзяць заводы, збіраюць аўтамабілі і трактары. Зараз у нас вучыцца каля 14 тысяч студэнтаў першай ступені дзённай формы навучання, каля сямі тысяч — завочнай формы, у каледжах — яшчэ каля дзесяці тысяч, а таксама каля тысячы чалавек навучаюцца ў магістратуры і ліцэі. Штогод у нас павышаюць кваліфікацыю каля дзесяці тысяч чалавек. Не абыходзім увагай і падрыхтоўку спецыялістаў для замежных краін: іх выпусцілі больш за дзевяць тысяч для 90 краін свету.

Універсітэт штогод удасканальваецца. За апошнія дзесяць гадоў тут змяніліся і актуалізаваліся прыкладна 30 спецыяльнасцяў.

— Гэта сістэмная праца. Заўсёды бяром арыенцір на развіццё адукацыйнага працэсу, навукі і інавацый. Мы ўвялі новыя навучальныя праграмы, гэта найперш датычыцца актуалізацыі тых кірункаў, якія сёння запатрабаваныя ў нашай краіне. Напрыклад, калі дагэтуль мы рыхтавалі спецыялістаў па спецыяльнасці «Паратурбінныя ўстаноўкі атамных электрычных станцый», то сёння пачалі навучанне па праграме «Праектаванне і эксплуатацыя атамных электрастанцый», — гэта значна пашырыла кола магчымасцяў для выпускнікоў, якія прыходзяць працаваць на атамную станцыю, цяпер там яны могуць займаць вялікі пералік розных пасадаў. Актуалізавалі падрыхтоўку і па спецыяльнасці «Гарадскі электрычны транспарт», дзе раней рыхтавалі спецыялістаў для «Белкамунмаша», БелАЗа, праектавалі тэхніку з электрапрывадам. Зараз кірунак пашырыўся і спецыяльнасць мае назву «Электрычныя і аўтаномныя транспарт».

СТАР. 12

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «Самае галоўнае — захаваць жыццё чалавеку»

## СІТУАЦЫЯ КАНТРАЛЮЕМАЯ

Аляксандр Лукашэнка падчас пасяджэння абласнога штаба па пытаннях супрацьдзеяння каранавіруснай інфекцыі ў Віцебскім аблвыканкаме паведаміў, што мэта яго прыезду — асабіста азнаёміцца з рэальным станам спраў на месцах з лячэннем людзей. Па яго словах, на Віцебшчыне назапашаны вялікі вопыт у барацьбе з інфекцыяй.

***«Сітуацыя ў свеце вельмі напружаная, калі не сказаць больш. Няпростая сітуацыя і ў Беларусі. Так, сітуацыя няпростая, але пад кантролем, як бы камусьці гэтага ні хацелася.*** Я ўжо губернатара некалькі разоў дапытаў па дарозе па сітуацыі, і я бачу па яго настроі: ніякай крытычнай сітуацыі ў вобласці няма і быць не павінна», — сказаў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што ў горадзе ёсць свой медыцынскі ўніверсітэт, адпаведная кафедра, якая рыхтуе кадры для барацьбы з каранавірусам.

«У нас у краіне сёння задзейнічаны каля 500 апаратаў ШВЛ, а задзейнічаць можам з наркозна-дыхальнымі 2500. ***ШВЛ-апаратаў у нас дастаткова»,*** — адзначыў кіраўнік краіны.

## МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ І СРОДКІ

Па словах кіраўніка краіны, арганізацыйныя штабы ў рэгіёнах сыгралі значную ролю ў барацьбе з каранавірусам першай хвалі, таму і ў другую хвалю пайшлі такім жа шляхам. Абласныя і рэспубліканскі штабы пры Міністэрстве аховы здароўя арганізуюць лячэнне, пастаўку сродкаў аховы ўрачоў і лекаў з запасам.

***«Калі ў нас ёсць магчымасць мабілізаваць усе сілы і сродкі на рашэнне той ці іншай праблемы, тады ёсць вынік.*** А хто можа арганізаваць гэта ў Віцебскай вобласці? Вядома, губернатар са сваімі падначаленымі. Ён сёння адказвае за праблемы лячэння людзей больш, чым за нейкія іншыя, бо за гэтым стаяць жыцці нашых людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ТЭСТ — НЕ ГАЛОЎНЫ ПАКАЗЧЫК

Прэзідэнт растлумачыў: чым больш у краіне робіцца тэстаў, тым больш выяўляюць хворых. А цяпер лабараторных даследаванняў робяць у тры разы больш, чым пры першай хвалі,— амаль 30 000 у суткі.

«Што галоўнае ў статыстыцы? Пратэсціраваныя? Больш тэстаў — больш будзе гэтай заразы. Хто гэта адмаўляе? Ніхто. Мы праводзім сёння ў тры разы больш тэстаў, чым у першую хвалю. За 30 000 тэстаў у суткі. Калі б праводзілі 40 тысяч, было б яшчэ больш», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы, што такая тэндэнцыя характэрная для ўсяго свету.

Па яго словах, як толькі з'яўляюцца самыя нязначныя сімптомы каранавіруса ў хворага, яго тэсціруюць.

***«Галоўны паказчык — не тэсціраванне. Галоўны паказчык — колькі ў цябе ковідных пнеўманій у краіне.*** Сёння раніцай 21 500, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Самае небяспечнае, колькі ў нас знаходзіцца на ШВЛ. На сённяшнюю раніцу такіх 519».

## ПЕРАСТРАХАВАЦЦА — НЕ ЗАЛІШНЕ

Сітуацыяй, якая абнадзейвае, па словах Прэзідэнта, з'яўляецца тое, што ў бальніцы ўжо паступае менш чалавек, чым выпісалася. ***«Гэта сведчыць пра тое, што ў нас не будзе празмернага запаўнення бальніц.*** Вызваляюцца ложкі. А да гэтага часу ўсё прымалі людзей больш, чым выпісвалі», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён абверг інфармацыю, што з медустаноў выпісваюць людзей, якіх яшчэ неабходна было трымаць у стацыянары: «Глупства несусветнае. Не адзін урач не выкіне чалавека на амбулаторнае ці курортна-санаторнае лячэнне, калі ён бачыць, што пацыент не набыў устойлівую дынаміку выздараўлення». Больш за тое, у перапрафіляваных пад ковід-хворых медустановах урачы перастрахоўваюцца і на пару дзён «перацтрымліваюць» хворых.

## ЛОЖКАЎ ХАПАЕ

Цяпер у медыцынскіх стацыянарах краіны дастаткова месцаў для лячэння хворых на ковід, запэўніў Прэзідэнт.

***«У нас няма праблем з ложка-месцамі. Калі, скажам, крый божа, у Оршы не хопіць месцаў, можна будзе перакінуць людзей у Віцебск***, — сказаў ён. — Тут няма праблем. На машыне хуткай дапамогі на працягу гадзіны яго можна перавезці ў Віцебск. Гэтак жа з іншых раёнаў, калі там узнікнуць нейкія праблемы».

У вобласці зараз няма праблем з аказаннем медыцынскай дапамогі, спаслаўся на інфармацыю ад старшыні аблвыканкама Аляксандр Лукашэнка.

«Я і не чуў, каб яны былі ў нас па краіне. ***І мы навучыліся вельмі хутка рэагаваць, каб аказаць дапамогу людзям».***

## ПЫТАННЕ Ў АДКАЗ

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў негатыўныя каментарыі ў інтэрнэце з нагоды яго прыезду ў Віцебск. Яго абурылі наўмысна лжывыя выказванні пра ўмовы працы медыцынскага персаналу ў «чырвонай зоне», пра адносіны да супрацоўнікаў кіраўніцтва бальніцы. Ён заўважыў, што даўно ведае галоўнага ўрача радзільні як жорсткага кіраўніка, але дзякуючы гэтаму ў бальніцы парадак, лічыць Прэзідэнт.

«Мярзотнікі апошнія, — назваў аўтараў фэйкаў Аляксандр Лукашэнка. — Я гэтым мярзотным людзям хачу задаць толькі адно пытанне. Памятаеце, Еўрасаюз выдзеліў пасля выбараў адразу 54 мільёны еўра? Пратэстунам, пісакам гэтым. А 52 мільёны, па-мойму, — на лячэнне ад ковіду. Але гэтыя сродкі, як яны заявілі, Еўрасаюз, накіравалі грамадзянскай супольнасці для лячэння ковіду. Гэта значыць, ім. Дзе гэтыя грошы? Вось няхай напішуць, дзе 52 мільёны еўра, а гэта 55 мільёнаў долараў, на ўсякі выпадак, прыкладна, дзе яны?»

Гэтыя грошы, па словах кіраўніка дзяржавы, даюцца тым, хто «бадзяецца па вуліцах».

«Але ўжо зараз вы нават іх чытаеце і бачыце: не хапае. Гэтыя беглыя, напэўна, паўтары сотні ўжо пабеглі ў Літву—Латвію, і пакуль ідуць сюды грошы, яны іх там перахопліваюць, — сказаў беларускі лідар. — І нашы пратэстуны, якія тут пад дубінкі АМАПа, як яны кажуць, ходзяць, унюхалі гэта, дык, кажуць, мы пад дубінкі ідзём, а яны нашы грошы забіраюць. Вось дзе іх грошы. Ім за гэта плацяць, каб абылгаць, зняславіць людзей прыстойных, якія сёння працуюць у гэтых «чырвоных зонах».

## СПРАВА НЕ Ў СТАТЫСТЫЦЫ

Самы галоўны паказчык — смяротнасць, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы на пасяджэнні штаба па прафілактыцы распаўсюджання каранвіруснай інфекцыі. За апошнія суткі ў Віцебскай вобласці ад каранавіруса памерла два чалавекі, удакладніў ён. Напярэдадні — ніводны.

«Гэта ў Віцебскай вобласці, якая ў нас сёння — не лепшая», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Па краіне гэтая лічба таксама параўнальна невялікая, дадаў ён і абурыўся тым, што некага гэта не задавальняе.

Патрабаванне будзе, перш за ўсё, на захаванне жыцця, паўтарыў ён і заклікаў, каб яго пачулі кіраўнікі ўсіх рэгіёнаў. ***«Самае галоўнае — захаваць жыццё чалавеку, усё астатняе другаснае»,*** — падкрэсліў ён і дадаў, што глыбока паглыблены ў гэтую тэму і не мае пакуль прэтэнзій ні да міністра аховы здароўя, ні да кіраўнікоў рэгіёнаў па арганізацыі медыцынскай дапамогі хворым.

***«Дзякаваць богу, у нас тысячамі за суткі не гінуць людзі, нават сотнямі не гінуць,*** — дадаў ён. — ***І не будуць гінуць, бо мы ўсе, ад старшыні сельскага Савета, райвыканкама, аблвыканкама да Прэзідэнта, прэм'ер-міністра і міністра, тым больш, займаемся гэтай праблемай і будзем займацца, мы будзем ратоўваць нашых людзей наколькі гэта магчыма.*** І людзі пра гэта павінны ведаць».

Пытанні лячэння і выратавання людзей найважнейшыя, паўтарыў Прэзідэнт. Ён спытаў прысутных, чаго не хапае ў рэгіёне: урачоў, сродкаў індывідуальнай аховы, лекаў? «Кажыце шчыра, у гэтым будынку мы прымем любое рашэнне, нават немагчымае. І ў сілу нашага жадання працаваць, мы рэалізуем любое наша рашэнне», — рэзюмаваў ён.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
*г. Віцебск.*

## ❍ У ТЭМУ

### «Мы забяспечаны тымі прэпаратамі, што выкарыстоўваюцца ў вядучых клініках свету»

Медыцынскія ўстановы Віцебшчыны забяспечаны ўсімі неабходнымі лекавымі сродкамі для барацьбы з каранавіруснай інфекцыяй, нават самымі дарагімі. Пра гэта журналістам паведаміла **Таццяна КАВАЛЁВА, галоўны ўрач Віцебскай абласной інфекцыйнай бальніцы.** «Ёсць абсалютна ўсё. Праблема гэтай інфекцыі не ў тым, што чагосьці няма. Мы забяспечаны тымі прэпаратамі, што выкарыстоўваюцца ў вядучых клініках свету», — сказала Таццяна Кавалёва.

Па яе словах, кафедры інфекцыйных хвароб медыцынскіх універсітэтаў краіны адсочваюць і ўкараняюць усе навінкі па лячэнні, што з'яўляюцца ў свеце.

«У мяне выклікае нават захапленне і ўдзячнасць, што мы так хутка рэагуем на сусветныя дасягненні. Па медыкаментознай тэрапіі ніякіх праблем сёння не бачу. Так, гэтыя прэпараты не льюцца ракой, але для іх ёсць і пэўныя паказанні. І каб увесці гэты прэпарат, каму трэба, таксама неабходнае прафесійнае ўменне», — падкрэсліла медык.

Як паведаміла Таццяна Кавалёва, няма праблем і са сродкамі індывідуальнай аховы (СІА), з імі навучыліся працаваць як у вядучых краінах свету. «Сёння праскокваюць звесткі, што медперсанал па некалькі разоў надзявае адзін і той жа СІА. Гэта так, але гэта не кажа пра іх дэфіцыт. Справа ў тым, што выпрацаваны пэўныя методыкі абеззаражвання СІА кварцам, і паверце, што ў нас ні адзін чалавек персаналу ад гэтага не заразіўся і не захварэў», — растлумачыла галоўны ўрач.

Забяспечаны неабходнымі сродкамі медустановы раённых цэнтраў. Ім аказваецца і кансультацыйная дапамога спецыялістаў з вобласці.

«Калі ў іх ёсць пэўныя складанасці, гэта вырашаецца ці пераводам пацыентаў, ці выездам на кансультацыю. Мы праводзім велізарную кансультацыйную работу не толькі ў рэжыме анлайн ці тэлемедыцынскіх кансультацый, але і ў рэжыме выезду», — паведаміла Таццяна Кавалёва.

### «Чакаем вакцынацыю»

**Уладзімір СІНКЕВІЧ, галоўны ўрач Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя** адзначыў: верагодна, спецыялісты ведаюць адказ на пытанне, калі скончыцца захваральнасць?

«Чакаем вакцынацыю — найбольш правільны варыянт для ўсіх паветрана-кропельных захворванняў. Пакуль яе няма. Таму думаем, калі скончыцца другая хваля. Мы мяркуем, што з'явіліся ў Віцебскай вобласці, у прыватнасці, прадвеснікі абнадзейвання», — расказаў медык.

Сярод іх — зніжэнне захваральнасці вострымі рэспіраторнымі захворваннямі, у шэрагу пацыентаў усё менш дарослых.

Занепакоенасць ва Уладзіміра Сінкевіча да гэтага часу выклікае невыкананне насельніцтвам рэкамендацый медработнікаў — незахаванне рэспіраторнага этыкету, сацыяльнага дыстанцыявання.

У штабы па прафілактыцы інфекцыі, па словах спецыяліста, уваходзяць не толькі медыцынскія работнікі. Сумесная работа органаў улады дазваляла дабівацца хуткіх вынікаў па атрыманні сродкаў індывідуальнай аховы, медыкаментозным лячэнні.

«Пасяджэнні штабоў праводзіліся амаль кожны дзень. Сёння ўжо выпрацаваны механізм. Штаб працягвае функцыянаваць амаль што ў былым фармаце, але змяняюцца мэты, задачы, тэрміны правядзення. Асноўная задача — забеспячэнне змяншэння захваральнасці каранавіруснай інфекцыяй», — сказаў Уладзімір Сінкевіч.

## ❍ КАМПЕТЭНТНА

**Падчас візіту кіраўніка дзяржавы ў адну з медыцынскіх устаноў Віцебскага рэгіёна і пасяджэння штаба па супрацьдзеянні распаўсюджванню каранавіруса закранулася тэма правакацыйнай і лжывай інфармацыі, якая датычыцца медыцыны, расказаў журналістам міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.**



Фота БелТА.

«З усёй адказнасцю заяўляю, што выплаты «ковідных надбавак», згодна з указам кіраўніка дзяржавы, адбываліся, адбываюцца і будуць адбывацца роўна да таго часу, пакуль у нас не скончыцца эпідэмічная сітуацыя. Пакуль не скончацца апошнія пацыенты, якім у сістэме аховы здароўя аказваецца дапамога, пацыенты менавіта з ковіднай інфекцыяй, — запэўніў ён. — Гэтае пытанне з'яўляецца адным з прыярытэтных разам з забеспячэннем лекамі, сродкамі індывідуальнай аховы і ўвогуле ў цэлым з аказаннем медыцынскай дапамогі».

Міністр таксама заявіў, што сродкаў індывідуальнай аховы ў краіне хапае ў поўным аб'ёме, больш за тое, сфарміраваны запас прыкладна на месяц. З гэтым няма праблем яшчэ і таму, што практычна ўсе яны вырабляюцца ў Беларусі, дадаў ён.

«Падчас эпідэмічнай сітуацыі мы абмяжоўваем колькасць пацыентаў, якія прыходзяць у паліклініку з рознымі пытаннямі. Такім чынам дэталізуюцца рашэнні пра тое, што дыспансерызацыя, нейкія пытанні, якія можна адкласці, не вырашаюцца (у прыватнасці, у паліклініках Мінска. — **«Зв.»**), але планавая спецыялізаваная дапамога будзе аказвацца ў стацыянарных установах, па-за паліклінікамі, каб захаваць сацыяльнае дыстанцыяванне. Пацыенты, якія не маюць патрэбы ў дапамозе тут і зараз, не павінны збірацца разам у адным месцы», — пракаментаваў ён адно з паведамленняў у інтэрнэце.

Галоўнай тэмай пасяджэння Віцебскага рэгіянальнага штаба па супрацьдзеянні распаўсюджанню каранавіруснай інфекцыі стаў аналіз таго, ці ўсё робіцца для аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву, якая звязаная з ковід-інфекцыяй, і ў цэлым, расказаў кіраўнік ведамства.

«Калі казаць пра фінансаванне, губернатар пацвердзіў і маніторынг паказаў, што яно адбываецца ў поўным аб'ёме, — дадаў Дзмітрый Піневіч. — Ковід-інфекцыя — гэта не толькі медыцынская праблема, каб супрацьстаяць ёй, неабходна ўзаемадзеянне народна-гаспадарчай і сацыяльнай сфер. Мы сёння абмяркоўвалі, як працуюць нашы школы, інтэрнаты, установы культуры, як захоўваецца масачны рэжым і як гэта ўплывае на работу рэгіёна».

Штаб Віцебскага рэгіёна паспяхова выконвае сваю функцыю, зрабіў выснову міністр.

Вяртаючыся да тэмы няпраўдзівай інфармацыі ў інтэрнэце, Дзмітрый Піневіч звярнуў увагу, што любы факт можна паказаць з розных бакоў, і падача, калі яна накіраваная на разбурэнне, не можа быць, на яго думку, аб'ектыўнай.

Ва ўрадзе

# ВЕРНЕМСЯ ДА РОСТУ

## Прэм'ер-міністр Беларусі падвёў вынікі года для Еўразійскай інтэграцыі

**«Год быў досыць складаны. Акрамя пандэміі, якая аказала негатыўны эфект практычна на ўсе сферы сусветнай эканомікі, многія з нашых дзяржаў сутыкнуліся з іншымі сур'ёзнымі праблемамі гарантавання нацыянальнай бяспекі, — сказаў Раман Галоўчанка, які на сёння з'яўляецца старшынёй Міжурадсавета. — Шмат у чым дзякуючы сумесным намаганням, нам удалося змякчыць наступствы шокаў. У гэтай няпростай сітуацыі наш саюз даказаў сваю эфектыўнасць».**

У якасці сведчання сказанага прэм'ер Беларусі прывёў паспяховыя дзеянні дзяржаў — членаў ЕАЭС ва ўмовах сусветнага дэфіцыту, які рэзка ўтварыўся ў першую хвалю COVID-19.

«Сваімі ўзгодненымі і аператыўнымі рашэннямі мы змаглі забяспечыць не толькі ўнутраныя рынкі сродкамі індывідуальнай аховы, дэзынфекцыі, але і іх экспартныя пастаўкі. Нам удалося не дапусціць росту цэн на сацыяльна значныя тавары на нацыянальных спажывецкіх рынках. У мэтах аказання дапамогі ў барацьбе з пандэміяй былі арганізаваныя кантакты па лініі органаў аховы здароўя для абмену ведамі, вопытам, практыкамі ў лячэнні каранавіруса», — пералічыў ён.

Для запавольвання працэсу распаўсюджвання каранавіруса не ўдалося пазбегнуць жорсткіх мер па абмежаванні перамяшчэння пасажыраў паміж краінамі — членамі ЕАЭС, са шкадаваннем адзначыў старшыня Міжурадсавета. Ён выказаў спадзяванне, што з улікам вопыту па стрымліванні інфекцыі і па барацьбе з ёй, які ўжо атрыманы, міністэрствы аховы здароўя, транспарту, іншыя зацікаўленыя ведамствы выйдуць на больш актыўны дыялог па паступовым аднаўленні зносін для аблягчэння дзелавых кантактаў і дзелавой міграцыі.

Раман Галоўчанка заўважыў, што пры гэтым удалося захаваць таварапаток, а значыць, забяспечыць функцыянаванне міждзяржаўных гандлёвых адносін, захаваць ланцужкі тавараў і паслуг.

«Ліха без дабра не бывае. Упэўнены, што пандэмія падштурхне наш саюз да больш хуткага ўкаранення лічбавых тэхналогій у розных сферах жыццядзейнасці, у тым ліку ў ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур, укаранення электроннага дакументаабароту», — дадаў ён. — У бягучым годзе колькасць бар'ераў на ўнутраным рынку саюза знізілася з 19 да 11, праўда ўзнікаюць новыя, таму гэтую тэму рана здымаць з кантролю».

Беларускі прэм'ер звярнуў увагу Еўразійскай эканамічнай камісіі на актывізацыю работы па міжнародным кірунку, перш за ўсё па рэалізацыі адносін з ініцыятывай «Адзін пояс — адзін шлях».

«Гэта будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці груза- і пасажыраперавозак праз скарачэнне тэрмінаў мытнага кантролю і цэлага шэрагу іншых працэдур, што ў выніку прывядзе да скарачэння выдаткаў для бізнесу», — абазначыў карысць ад праекта Раман Галоўчанка і адзначыў неабходнасць больш актыўнай рэалізацыі мемарандума па паглыбленні ўзаемадзеяння паміж выканкамам СНД і ЕЭК.

«Вырашэнню гэтай задачы будзе аддадзена асаблівая ўвага падчас старшынства ў 2021 годзе Беларусі ў СНД, — сказаў ён. — Спадзяёмся на падтрымку ў гэтым пытанні Казахстана, які будзе старшынстваваць у ЕАЭС».

У год свайго старшынства ў ЕАЭС Беларусі не ўдалося зняць усе пытанні і дасягнуць усіх амбіцыйных мэт, прызнаўся старшыня Міжурадавага савета. Разам з тым ён выказаў упэўненасць, што праграма беларускага старшынства знойдзе свой працяг і ў наступнай рабоце ЕЭК. «Бо ў ёй былі закладзены пасылы, якія адлюстроўваюць шчырае імкненне Беларусі да паступовага развіцця еўразійскай інтэграцыі па ўсіх кірунках», — рэзюмаваў Раман Галоўчанка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

У чаканні цудаў

# ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ НАВАГОДНЯЯ ПРАГРАМА Ў СТАЛІЦЫ?

**Напярэдадні калядных і навагодніх свят сталічныя прадпрыемствы гандлю стварылі неабходныя запасы кандытарскіх вырабаў, шампанскага і іншай прадукцыі. Аб гэтым расказаў начальнік аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Дзмітрый ПЛЯХАНАЎ.**



Фота БелТА.

— Асартымент навагодніх падарункаў «Камунаркі» налічвае каля 60 найменняў. Прадукцыя расфасаваная ў розныя па форме і памеру баулы, тубы, мяккія цацкі, у тым ліку ў выглядзе быка — сімвала надыходзячага года. Арганізацыямі гандлю горада ўжо адгружана больш за 200 тысяч такіх набораў. Рознічныя цэны складаюць ад 4,7 рубля за 300 грамаў да 20,6 рубля за кілаграм. Прадстаўлены і тавары фабрыкі «Спартак» — ад 3,9 рубля за 300 грамаў да 18,42 рубля за 1,5 кілаграма. Айчынныя вытворцы прапануюць шырокі асартымент шампанскага і пеністых вінаў па цане ад 5,36 рубля да 15 рублёў за 0,75 літра.

У сталічных універмагах працуюць спецыялізаваныя аддзелы, секцыі для продажу тавараў з навагодняй тэматыкай. Спажыўцам прапануецца больш за тры тысячы найменняў ёлачных упрыгажэнняў, сувеніраў і іншай святочнай атрыбутыкі ў шырокім цанавым дыяпазоне.

— Асаблівым попытам у гэтым сезоне ў пакупнікоў карыстаюцца светлавыя гірлянды на батарэйках, навагоднія галінкі з ягадамі і шышкамі, букеты з кветкамі ў выглядзе калядной зоркі і драўляныя ўпрыгажэнні. Нарасхват прадукцыя айчыннага вытворцы ёлачных цацак «Белпалм», які вырабляе ўпрыгажэнні як для масавага спажывання, так і ручной работы, а таксама пад даўніну. Як сведчыць попыт мінулых гадоў, актыўны продаж ёлачнай атрыбутыкі чакаецца з сярэдзіны снежня. У сталічных крамах прадстаўлена больш за сто відаў штучных навагодніх дрэў, — гэта не толькі елкі, але і хвоі. З іх больш за 40 відаў — беларускай вытворчасці па рознічных цэнах ад 6,7 рубля да 802 рублёў. Для ранішнікаў і дзіцячых забаўляльных праграм прапануецца больш за сто відаў карнавальных касцюмаў і масак ад 11 да 85 рублёў. Традыцыйныя касцюмы Дзеда Мароза і Снягуркі можна набыць у цанавым дыяпазоне ад 95 да 190 рублёў.

У гандлёвых аб'ектах сталіцы для наведвальнікаў падрыхтаваны шматлікія акцыі, распродажы і зніжкі — у снежні запланавана 1,5 тысячы розных мерапрыемстваў.

— Напрыклад, універмаг «Беларусь» 18 снежня будзе працаваць да 23 гадзін. У гэты дзень там адбудзецца акцыя «Карнавальная ноч» падчас якой будуць зніжкі ў памеры 30 % на нехарчовыя тавары і 10 % — на харчовыя. Усе пакупнікі, якія прыйшлі ў навагоднім карнавальным касцюме, атрымаюць купон на 30 % на падарунак, ім можна будзе скарыстацца не толькі ў гэты дзень, а да 31 снежня ўключна. 24 снежня пройдзе акцыя «Цуды здзяйсняюцца», зніжкі складуць 30 % на нехарчовую прадукцыю і 10 % на харчовыя тавары. Завершыць работу універмаг 29, 30 і 31 снежня акцыяй «Навагодні перапалох», прыцягваючы пакупнікоў зніжкамі ў 20 % на нехарчовыя тавары і 5 % на харчовыя. ГУМ з 20 да 22 снежня правядзе акцыю «Час чарадзейства» са зніжкамі ў памеры 32 % на нехарчовыя тавары. А ў гандлёвым цэнтры «Кірмаш» па ўсіх трох адрасах пакупнікоў будуць чакаць бонусы з 25 да 27 снежня. У гэтыя дні пройдзе акцыя «Калядныя зніжкі» — нехарчовую прадукцыю можна будзе купіць танней на 32 %. Гандлёвы цэнтр «Сталіца» ў перыяд з 25 да 27 снежня прапануе пакупнікам зніжкі ад 10 да 50 %. На аб'ектах грамадскага харчавання адбудзецца 850 выставак-продажаў кулінарных і кандытарскіх вырабаў у аўтарскім выкананні майстроў-кандытараў і майстроў-кухараў сталіцы.

Навагоднія кірмашы ў сталіцы пачнуць працаваць з 18 снежня, адзначыў Дзмітрый Пляханаў. На Кастрычніцкай плошчы «Калядны кірмаш» будзе прымаць гасцей да 14 студзеня. У перыяд з 18 да 23 снежня гандаль тут будзе праводзіцца з 12 да 20 гадзін, з 24 да 30 снежня — з 12 да 23 гадзін. У навагоднюю ноч кірмаш будзе працаваць да 4 гадзін раніцы, з 2 да 14 студзеня — з 12 да 20 гадзін.

— На Кастрычніцкай плошчы будзе прадстаўлена ўжо знаёмая канцэпцыя каляднага кірмашу з 12 шклянымі гандлёвымі павільёнамі, падобнымі на соты. Свае тавары прапануюць павільёны «Беларускія далікатэсы», «Бабуліны гасцінцы» — там можна пакаштаваць смажаныя і печаныя піражкі з начынкамі ў найлепшых беларускіх традыцыях, «Цешчын дом» прапануе блінцы, а таксама наліўкі, «Шашлычны дом» — адпаведную прадукцыю са свініны і мяса птушкі, каўбаскі грыль з фірмовым хлебам, а таксама медавуху. У павільёне «Бульбаш» варта паласаваца традыцыйнымі стравамі з «другога хлеба», а ў "Здаровым фастфудзе» — сэндвічамі, роламі, бургерамі, хачапуры. Для аматараў салодкага ў павільёне «Мара прысмакаў» можна будзе знайсці булачныя і кандытарскія вырабы, свежую выпечку, дэсерты.

У раёне Палаца спорту «Калядны кірмаш» таксама будзе працаваць з 18 снежня да 14 студзеня з 14 да 23 гадзін у будныя дні і з 12 да 23 гадзін у выхадныя, у навагоднюю ноч — да чатырох гадзін. Гандаль тут разгорнецца ў драўляных шале, у якіх будзе прадстаўлены шырокі асартымент навагодніх тавараў: ад традыцыйных упрыгажэнняў і падарункаў да прадукцыі харчовай і лёгкай прамысловасці. Будзе арганізавана і культурна-забаўляльная праграма: атракцыёны, фотабудкі, 5D-кінатэатр, катанне на поні.

— Гандаль будзе весціся ва ўсіх дзевяці адміністрацыйных раёнах сталіцы, — дадаў спікер. — Напрыклад, у Маскоўскім у парку Паўлава 19 снежня ў перыяд з 11 да 16 гадзін адкрыецца калядны кірмаш і святочна-забаўляльная праграма. У Першамайскім раёне на тэрыторыі Цэнтральнага батанічнага сада з 10 снежня да 10 студзеня 2021 года — масавае мерапрыемства «Зімовы квэст», гасцям якога будуць прапанаваныя гульні, ёлачная зона, дзе будзе размешчана хатка Дзеда Мароза і зона фуд-корту. У Савецкім адбудзецца аднадзённы калядны кірмаш у дзень святкавання Каляд. У навагоднюю ноч гулянні будуць доўжыцца да трох гадзін раніцы.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Рэкордныя $35 млрд спатрэбяцца на гуманітарную дапамогу



Для дапамогі людзям, якія жывуць у нястачы, налета трэба будзе сабраць рэкордную суму. Паводле ацэнак даклада ААН «Глабальны гуманітарны агляд», на фоне пандэміі каранавіруса 235 мільёнам чалавек у свеце спатрэбіцца падтрымка ў той ці іншай форме. Пры гэтым колькасць насельніцтва, якое жыве ў нястачы, вырасла на 40 працэнтаў у параўнанні з папярэднім годам. «Рост амаль цалкам абумоўлены COVID-19», — заявіў намеснік генеральнага сакратара ААН па гуманітарных пытаннях Марк Лаўкок. У ААН адзначылі, што пандэмія ў найбольшай ступені закранула тых жыхароў Зямлі, якія і без яе знаходзіліся ў вельмі складаных умовах. Адзначаецца, што ўпершыню з 1990-х гадоў павінны ўзрасці маштабы крайняй галечы, смяротнасць ад ВІЧ, сухотаў і малярыі, адчувальна зменшыцца працаздольнасць жыцця. «Верагодная найбольш трывожная з'ява — пагроза вярнення голаду, магчыма, адразу ў некалькіх месцах», — адзначыў Лаўкок.

## Данія спыніць здабычу вуглевадародаў у Паўночным моры



Гэтая паўночная краіна не будзе выдаваць новыя ліцэнзіі на распрацоўку нафтавых і газавых радовішчаў у Паўночным моры і цалкам спыніць здабычу да 2050 года. Урад дасягнуў пагаднення з парламентам аб адмове ад запланаванага раней восьмага раўнда ліцэнзавання, а таксама ад любых новых разведачных работ. Аб гэтым паведаміў міністр клімату і энергетыкі краіны Дэн Ёргенсэн. «Мы з'яўляемся найбуйнейшым вытворцам нафты ў Еўрапейскім саюзе, і таму гэта рашэнне знойдзе водгук ва ўсім свеце», — сказаў ён. Умовы для нафтагазавых кампаній, якія працуюць цяпер у дацкіх водах, застануцца нязменныя да прыпынення здабычы ў 2050 годзе. Паводле ацэнак міністэрства, гэта рашэнне абыдзецца краіне прыкладна ў 13 млрд крон ($2,1 млрд), паведаміла агенцтва Bloomberg. Данія неаднаразова заяўляла пра сябе як пра сусветнага лідара ў пытаннях клімату і ўжо абвясціла аб шэрагу самых амбіцыйных у свеце мэт па зніжэнні выкідаў, што забруджваюць атмасферу. Краіна імкнецца скараціць выкіды парніковых газаў на 70 % да 2030 года і дасягнуць іх нулявога ўзроўню да 2050 года.

## Іспанскія археолагі знайшлі велізарны ісламскі некропаль



Археолагі ў Іспаніі выявілі каля 400 магільняў у велізарным ісламскім некропалі VIII стагоддзя, размешчаным у правінцыі Сарагоса. Паводле ацэнак экспертаў, на гэтых могілках магло быць пахавана каля 4500 чалавек. Гэтая знаходка змяняе ўяўленні навукоўцаў пра гісторыю мусульманскай абшчыны ў рэгіёне ў эпоху арабскіх заваяванняў і ўсталявання халіфата. Археалагічныя раскопкі на гэтым месцы пачаліся ў 2010 годзе, але толькі цяпер спецыялісты разумеюць маштабы пахавання. Знойдзеныя астанкі перададзены ў лабараторыю для правядзення аналізу ДНК і наступных даследаванняў. Улады аўтаномнай супольнасці Арагон, у склад якой уваходзіць правінцыя Сарагоса, прынялі рашэнне вызваліць прастору ад магіл, бо на гэтым месцы будуецца дарожная інфраструктура. Разглядаецца магчымасць перапахавання астанкаў.

# «Нам усім неабходна прасіць у Бога мудрасці і разважлівасці»


Фота БелТА.

## «Родная зямля — непаўторная»

***— Уладыка, ці спраўдзіліся вашы чаканні за перыяд, які мінуў з дня прызначэння на пасаду Патрыяршага Экзарха? Ці былі нечаканасці, нягледзячы на тое, што вы — чалавек, які ў сябе дома, не прыезджы, і ўсё вам тут знаёмае?***

— Пытанне досыць аб'ёмнае, і адказам адразу ўсяго не ахапіць.

Тут дарэчы згадаць народную прыказку: дамашняя думка ў дарогу непрыдатная. Нешта падобнае — з маімі ўяўленнямі пра тое, якое гэта служэнне і як яго праходзіць. Я бачыў служэнне ўладыкі мітрапаліта Філарэта, калі быў вікарным епіскапам, бачыў служэнне ўладыкі мітрапаліта Паўла — таксама некаторы час быў у яго вікарным епіскапам. І потым, калі меў зносіны па меры неабходнасці з уладыкам Паўлам, бачыў, якія гэта аб'ёмы клопату. Заўсёды здзіўлялі маштабы работы і адказнасці, зыходзячы з гэтага фарміравалася маё ўяўленне пра служэнне Патрыяршага Экзарха.

Але цяпер, калі прыступіў да гэтага служэння, калі мінула тры месяцы, бачыцца яно ўжо крыху інакш. Хоць яшчэ не ўсе дэталі вядомыя, бо з кожным днём адкрываецца нешта новае і ў зносінах, і па той рабоце, якая вядзецца ў экзархаце. Усё гэта патрабуе асэнсавання, падтрымкі, удасканалення.

За гэты час удалося аб'ехаць усе епархіі. Недзе праграма была больш насычаная, недзе менш, але стараўся апроч удзелу ў богаслужэннях сустрэцца з духавенствам, пагаварыць з міранамі, наведаць сацыяльныя або адукацыйныя ўстановы, пагутарыць з ваеннаслужачымі, са студэнтамі.

Звяртае на сябе ўвагу, што кожны рэгіён па-свойму непаўторны і мае менавіта рэгіянальныя нюансы, якія трэба ўлічваць, каб правільна паступіць. Напрыклад, Беларусь на ўсходзе і на захадзе адрозніваецца сваёй рэлігійнасцю, традыцыямі — такая гістарычная спадчына. Ёсць розніца паміж Віцебшчынай і Гомельшчынай, паміж Гроднам і Брэстам. Скажам, на Гродзеншчыне шмат каталіцкіх абшчын, а ў Брэсцкай вобласці — пратэстанцкіх. Гэта таксама трэба ўлічваць. Вельмі самабытнае Палессе, там ёсць свае асаблівасці царкоўнага жыцця, якія выцякаюць з укладу жыцця мясцовых людзей.

У Мінску найбольш шырока прадстаўлены розныя канфесіі і меркаванні, часам дыяметральна супрацьлеглыя, тут пражывае шмат людзей розных нацыянальнасцяў, знаходзяцца ўстановы, у якіх прымаюцца вызначальныя для жыцця краіны рашэнні, міністэрствы і ведамствы, пасольствы.

Разам з тым, кожны рэгіён мае свой напрацаваны вопыт, які можа быць карысны ў межах усяго экзархата. Напрыклад, у Бабруйску ёсць сацыяльны цэнтр «Пакровы», які паспяхова працуе, пры гэтым вопыт сваёй работы гатовы перадаваць і для іншых рэгіёнаў. У Тураўскай епархіі добра пастаўленая работа з навучальнымі ўстановамі, і яе можна выкарыстоўваць у сталіцы. У Гродна паспяхова працуюць у экалагічным кірунку.

***— Можна сказаць, што Беларусь адкрылася па-новаму?***

— Так. Нешта раней было вядома часткова, не да канца асэнсавана. Цяпер мае новыя абавязкі падштурхоўваюць да таго, каб глыбей унікаць ва ўсё, аналізаваць, параўноўваць, знаходзіць найлепшае і карыснае, каб больш шырока гэта выкарыстоўваць. Нездарма кажуць: век жыві — век вучыся.

Родная зямля непаўторная і нават у межах аднаго рэгіёна можна са здзіўленнем адзначыць, як два населеныя пункты адрозніваюцца па сваім унутраным змесце, наколькі розныя людзі там жывуць. Гэта патрабуе ўважлівых адносін да рэальнасці. Разам з тым ёсць агульная для ўсіх платформа, на якой мы знаходзімся — Евангельскае вучэнне, вучэнне Царквы, маральная спадчына народа.

***— Уладыка, што ў гэтыя месяцы надавала вам сіл? Што натхняла і радавала?***

— Слова Божае нам кажа: «Гасподзь дасць сілу народу Свайму, Гасподзь благаславіць народ Свой мірам». Магчымасці, сілы служэння, нясенне послуху дае Гасподзь, Ён жа з'яўляецца крыніцай натхнення.

Мяне таксама вельмі натхняе магчымасць малітоўных зносін, калі бачна, што людзі старанна моляцца і ад малітвы атрымліваюць карысць, суцяшэнне, радасць, і гэта бачна па іх тварах. Дзеля гэтага хочацца і надалей служыць ды вяртацца ў тыя мясціны, дзе была здзейснена такая супольная малітва.

Акрамя таго, падчас размоў за чаем, трапезай, пасля богаслужэння даведваюся аб праектах, якія даюць людзям сілы, маюць плён, і тады мне таксама перадаецца радасць ад зробленага і ўзнікае жаданне дапамагчы, падтрымаць, каб вынік быў яшчэ лепшы.

Вельмі запамінаюцца сустрэчы з моладдзю і дзецьмі, іх хваляванне і шчырасць.

***— Як пандэмія каранавіруса адбіваецца на жыцці праваслаўных абшчын?***

— Пандэмія — гэта сусветная з'ява, якая прымушае чалавецтва задумацца пра тое, што не так у нашым жыцці. Парушаны асновы спакойнага жыцця, прыйшло перажыванне за хваробу, за ім адбываюцца хваляванні ўнутры грамадства. Але ўсё гэта мае і духоўныя карані.

Што датычыцца царкоўнага жыцця, то калі вясной колькасць вернікаў у храмах значана скарацілася, то цяпер не так, хоць станоўчых тэстаў на каранавірус штодня рэгіструецца ў паўтара раза больш, чым тады. Напэўна, людзі менш баяцца, можа быць таму, што многія з іх блізкіх, знаёмых перажылі гэтую хваробу, нехта, магчыма, ужо прызвычаіўся і стаў больш бестурботны.

Зменшэнне колькасці прыхаджан вельмі адчувальнае для малых прыходаў, і ёсць у сувязі з гэтым пэўныя складанасці.

Што наконт перасцярогі, то храм, напэўна, з усіх грамадскіх мясцін найбольш абаронены, бо Гасподзь не жадае, каб людзі, якія прыходзяць да Яго, траплялі ў дадатковую небяспеку. Разам з тым у царкве дзейнічаюць фізічныя законы, якія ніхто не адмяняў, і нездарма нашы продкі казалі: «На Бога спадзявайся, а сам не давайся!» Таму мы павінны зрабіць усё, што ад нас залежыць, каб захаваць здароўе прыхаджан.

І калі мы гэта робім, то ўскладаем спадзяванні не столькі на свае намаганні, колькі на міласць Божую, бо Слова Бога нам кажа: «Калі Гасподзь не збудуе дома, марна працуюць будаўнікі яго; калі Гасподзь не ахавае горада, марна чувае варта». Гэтым і кіруемся.

Меры перасцярогі ў храмах выкарыстоўваюцца ўсе неабходныя, іншая справа, што не ўсе людзі гэта робяць: хтосьці забывае, хтосьці лічыць іх залішнімі, што няправільна.

Свяшчэннаслужыцелі гэтак жа, як іншыя людзі, перажываюць хваробы і смутак, непрыемнасці, якія маюцца ў грамадстве. Хварэюць свяшчэннікі і на каранавірус, ёсць і памерлыя з-за гэтай хваробы. Мы сочым за сітуацыяй, аналізуем яе, стараемся аператыўна рэагаваць з улікам рэкамендацый медыкаў.

## «Галоўнае — пакаянне»

***— Акрамя пандэміі, ваша служэнне на пасадзе Экзарха супала з досыць няпростым перыядам у грамадска-палітычным жыцці краіны. Вашы першыя дзеянні паказалі, як востра вы гэта перажываеце. Вы двойчы заклікалі да дадатковага посту і пакаяння. Па вашых адчуваннях, гэта паўплывала на настрой людзей, мела плён?***

— Першы раз я заклікаў да ўзмоцненай малітвы, трохдзённага посту і пакаяння хутка пасля прызначэння мяне на пасаду, гэта было прымеркавана да 13 верасня. Увечары гэтага дня, калі здзяйснялі малебнае спяванне і шмат людзей сабралася ў храме, адчуваўся ў людзей асаблівы малітоўны парыў, хоць разам з тым і пэўнае напружанне, перажыванне пра тое, як Гасподзь адгукнецца на нашы малітвы і які будзе вынік.

Другі такі заклік быў напярэдадні свята Крыжапастаўлення, тады ішоў хросны ход вакол Беларусі са Святым Крыжом прападобнай Ефрасінні Полацкай і спісам іконы Жыровіцкай Божай Маці. Калі 27 верасня мы завяршалі пост і малітвы, то напярэдадні адбывалася Ізнясенне для Устанаўлення аднаўленага Крыжа Тураўскага, якім абнесліся Мінскі кафедральны сабор пры вялікім зборы народу і малебным спяванні. Людзі потым дзяліліся, што адчувалі моцны ўздым.

Мяркую, што гэта ў цэлым адбілася на цячэнні падзей у нашым грамадстве, хоць, можа быць, не так істотна, як хацелася б. На жаль, не ўсе людзі ўдзельнічалі ў тым, да чаго быў заклік. Нехта пасціўся, нехта маліўся, нехта рабіў і тое, і тое, але галоўнае, пра што ішла размова, — гэта пакаянне, асэнсаванне свайго жыцця, аналіз таго, што зроблена дрэннага і як гэта выправіць. Далёка не ўсе людзі прайшлі гэтым шляхам. Я цікавіўся, ці шмат людзей было на споведзі, аказалася, далёка не ўсе. А гэта ж быў самы галоўны складнік — унутранае пачуццё чалавека, які перажывае свае памылкі, учынкі. Калі ён перажывае і са змірэннем просіць у Бога даравання, Гасподзь адгукаецца, падобна таму, як бацькі даруюць дзецям, калі тыя просяць прабачэння за дрэнныя ўчынкі.

Мы, дарослыя дзеці Айца Нябеснага, не заўсёды памятаем пра гэта, часам прычыны складаных і трывожных для нас працэсаў у грамадстве ўскладаем на іншага чалавека і не бачым наша ўкладанне ў гэты стан. Людзям уласціва асуджаць іншых, бачыць у іх дрэннае, а Царква вучыць, што трэба перш за ўсё выправіць сябе, тады будзе карысць і для цябе, і для навакольнага свету.

Наша Царква, згодна з вучэннем, якое пакінуў нам Спасіцель, не імкнецца змяніць увесь свет. Гэтага не рабіў і Хрыстос. Яго служэнне заключалася ў тым, каб прывесці да выпраўлення жыцця кожнага асобна ўзятага чалавека. Апостал Павел кажа: «Хрыстос Ісус прыйшоў у свет спасці грэшнікаў, з якіх першы — я». Нам важная такая ўвага да сябе, асэнсаванне сваёй грахоўнасці, шляхоў для выратавання.

Гэта не значыць, што мы ўхіляемся ад пытанняў, якія хвалююць грамадства. Мы не хаваемся ад адказнасці, але асэнсоўваем, што больш карысці будзе, калі Царква не ўдзельнічае непасрэдна ў вырашэнні праблем, але выказвае сваё меркаванне з пункту гледжання Евангелля і праз малітву стараецца дапамагаць людзям, якія з'яўляюцца дзецьмі Царквы.

Кожны чалавек у Царкве закліканы да таго, каб шукаць волю Божую ў кожным канкрэтным выпадку, у адпаведнасці з гэтым прымаць рашэнне, як яму паступіць, каб было правільна і як Бог хоча. Не заўсёды нашы эмоцыі, станоўчыя або адмоўныя, добрыя дарадцы. Нам усім неабходна прасіць у Бога мудрасці і разважлівасці ў гэтыя дні выпрабаванняў для нашага грамадства.

Мудрасць дасканалая прыходзіць звыш, як дараванне малітвы, як падарунак Божы. Той, хто не шукае ад Бога навучання, не ўбачыць правільнага рашэння. Але і той, хто шукае ў Бога навучання, але пры гэтым няўважлівы да сябе, можа прыняць сваю думку за волю Бога. Таму нам сёння неабходная асаблівая якасць, пра якую казалі святыя айцы: духоўнае няспанне ў сэнсе вельмі ўзважаных, асцярожных адносін да сваіх слоў, учынкаў. Аналіз таго, як яны адаб'юцца на людзях, якія побач, прынясуць ім карысць альбо шкоду. І галоўнае, ці будзе гэта ў адпаведнасці з воляй Бога, добрай і дасканалай, або супрацьлеглае, і тады вынік будзе нядобры і недасканалы.

## «Унутраная засяроджаная работа губляецца»

***— Чым для Царквы небяспечны сённяшні час з усімі яго асаблівасцямі — і пандэміяй, і грамадска-палітычнай абстаноўкай, і іншым?***

— Гасподзь кажа: «Я збудую Царкву Маю, і вароты пякельныя не адолеюць яе». Гэта значыць, што небяспекі як такой для Царквы няма. Кожны, хто жадае, зможа ў Царкве выратавацца. Іншая справа, што знешнія абставіны могуць перашкаджаць людзям прыходзіць у храм або выказваць сваю веру. Гэта можа быць звязана з пэўнай небяспекай для жыцця або стратай нейкіх зямных даброт. Усё вызначаецца верай чалавека.

Зараз увесь свет перажывае вялікую небяспеку ў сілу таго, што адыходзяць ад традыцыйных маральных каштоўнасцяў. Людзі становяцца менш рэлігійныя або рэлігійныя па знешніх прыкметах, а ўнутраная засяроджаная работа — увага да сябе, свайго сумлення, душы, якую вялі нашы продкі, цяпер забываецца, губляецца.

Сучасны спосаб жыцця, мысленні чалавека не мае гэтага на ўвазе. Сучасныя сродкі камунікацыі рассейваюць увагу чалавека і арыентуюць людзей на тое, што, з аднаго боку, трэба ад жыцця браць усё: «еш, пі, весяліся», як нам кажа ў негатыўным сэнсе Евангелле, калі выкрывае чалавечую прывязанасць да зямных даброт.

З іншага боку, ёсць разуменне ў чалавечай супольнасці, што мы можам і павінны ўсё зрабіць гарманічна і зручна для нас, павінны зрабіць гэта цяпер і так, як лічым патрэбным. Пры гэтым забываем, што Біблія дае нам шматлікія прыклады, адзін з якіх — будаўніцтва Вавілонскай вежы, якое мела цудоўны праект, але не было завершана, бо Гасподзь разбурыў планы людзей, якія былі Яму не пажаданыя. Вавілонская вежа — гэта прыклад намагання чалавека, краіны, народаў, якія стараюцца

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

нешта рабіць, але пры гэтым спадзяюцца толькі на сябе.

*— За пяцігоддзе ў раёне пабудавана амаль 17 тысяч $м^2$ жылля, а гэта без малога 140 кватэр. Цяпер будуецца 20-кватэрны дом па вуліцы 8 Сакавіка ў Карэлічах, 15 кватэр у ім будзе выдзелена для шматдзетных,* — падкрэсліў **намеснік старшыні райвыканкама, які курыруе пытанні будаўніцтва і ЖКГ, Аляксандр БЫЛІЧ.** *— А ад пачатку дзеяння Указа № 667 з 2009 года ў раёне выдзелена больш як 145 участкаў пад індывідуальную забудову. Цяпер узводзяць уласныя дамы 87 забудоўшчыкаў. Асабліва запатрабавана гэта ў Міры.*

За апошнія гады край прырос новымі сацыяльнымі аб'ектамі. Запрацаваў дзіцячы сад на 130 месцаў у г. п. Мір. Тут жа збудавана станцыя абезжалезвання, якая забяспечвае якасная пітной вадой тры тысячы жыхароў гарпасёлка. Адкрылі новы будынак Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. З'явілася аддзяленне гемадыялізу ў Карэліцкай цэнтральнай раённай бальніцы, цяпер хворым не трэба ехаць у суседні раён. Тры гады таму ўзвялі стаметровы жалезабетонны мост цераз Нёман, які злучыў з «вялікай зямлёй» некалькі вёсак. Цяпер трапіць да тутэйшых можна па дарозе ў чатыры кіламетры, а не аб'язджаць 60 кіламетраў па суседнім раёне.

Па ўсім відаць, што, нягледзячы на ўзрост і пэўныя цяжкасці, раён імкнецца да ўдасканалення новых творчых ды сельскагаспадарчых здабыткаў.

**Ірына СІДАРОК.**

Рыштаванні Бацькаўшчыны

# БЫЛЫ ТЭАТР САПЕГАЎ НАБЫВАЕ АБРЫСЫ

## Працягваецца рэстаўрацыя Ружанскага палаца. Цяпер у рабоце ўсходні корпус



Тэатральны корпус.

**Галоўная славутасць Ружан — палац роду Сапегаў. Нездарма ж яго некалі параўноўвалі з Версалем. Гэты велічны палац сталі рэстаўраваць адным з першых у вобласці. З той пары, як яго ўключылі ў дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі» ў 2008 годзе, у палаца з'явіўся шанц на новае жыццё. За гэты час многае зроблена, адноўлены ўсходні і заходні флігелі, уязная брама. З 2011 года працуе музей. Цяпер работы па аднаўленні перайшлі ва ўсходні корпус, дзе некалі былі тэатр і конны манеж.**

Будаўнікі прыйшлі сюды ў жніўні мінулага года. І вось былы прыдворны тэатр набыў абрысы гатовага будынка, такога, як быў пры Сапегах. Тэатр узнік у той час, калі Ружаны сталі магнацкай рэзідэнцыяй. У палацы, узведзеным архітэктарам Янам Бекерам, размясцілі карцінную галерэю, адну з найбагацейшых бібліятэк Еўропы. Для паўнаты культурнага комплексу спатрэбіўся тэатр. Яго адкрылі ў 1765 годзе. Каралі і князі, якія стаялі на чале дзяржаў, бывалі там гледачамі.

А вось артыстаў набіралі ў асноўным з дзяцей мясцовых сялян, навучалі танцавальнаму, балетнаму, вакальнаму майстэрствам. Навучанне было жорсткае, колькі поту і слёз праліта на тых падмостках! А тэатр, як сведчаць гістарычныя крыніцы, быў шыкоўны. Глыбокая сцэна падыходзіла для вялікіх балетных паказаў і оперных спектакляў. Сем планаў куліс давалі магчымасць мяняць дэкарацыі падчас дзеі. Па форме зала з двума ярусамі ложаў нагадвала падкову. Як у тэатры Фарнезэ ў італьянскай Парме, які, дарэчы, дзейнічае да гэтай пары. Аднаўленне палаца Сапегаў ідзе па чарцяжах Бекера, што захаваліся. У Ружанах ёсць копіі тых чарцяжоў, арыгіналы ж знаходзяцца ў Варшаўскай нацыянальнай бібліятэцы.

**Дырэктар палацавага комплексу Хрысціна ГЛУШКО** марыць пра той час, калі будзе зроблена ўнутранае ўладкаванне, адкрыецца кафэ, абсталююць гасцінічныя нумары, з'явіцца шматфункцыянальная зала са сцэнай і пасадачнымі месцамі для тэатральных пастановак і канферэнцый. Час заканчэння работ на гэтым участку не называецца, вядома, што ўсё залежыць ад фінансавання. Грошы з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў выдзяляюцца штогод. Напрыклад, сёлета, паводле слоў **галоўнага спецыяліста ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Арцёма БРУХАНА,** з рэспубліканскага бюджэту было выдаткавана мільён рублёў і каля 500 тысяч — з раённага.

Цікава, што тэатральны корпус летам пафарбавалі ў ярка-зялёны колер, у той час як сама ўязная брама і флігелі маюць бледна-аліўкавае адценне. Хрысціна Глушко растлумачыла, што колер быў атрыманы ў выніку экспертызы, якая праводзілася на рэштках колеравага слоя. Прынамсі, так сцвярджаюць рэстаўратары. Можа, і праўда, гаспадары некалі такім чынам рашылі выдзеліць тэатральны корпус. Ну а калі ў выніку навуковых пошукаў перамогу атрымае іншая гіпотэза, то перафарбаваць будынак не так і складана. Галоўнае, што ён ёсць, набыў свае гістарычныя абрысы, і турыстам можна расказваць аб высокапрафесійным тэатры, трупа якога складалася пераважна з прыгонных акцёраў.

Сёння палацавы комплекс — адзін з найважнейшых турыстычных аб'ектаў краіны, сюды едуць арганізаваныя экскурсіі і асобныя турысты. Музей складаецца з чатырох экспазіцыйных і выставачнай залаў. Працуе сувенірная крама, дзе прадаюцца вырабы майстроўрамеснікаў з керамікі, льну, саломкі. Папулярнасцю карыстаецца паслуга музейных работнікаў — урачыстая рэгістрацыя шлюбу ў непаўторнай гістарычнай атмасферы.

Летась палац наведалі 20 тысяч турыстаў, сёлета з-за эпідэмічнай абстаноўкі лічба будзе меншая. Але, як заўважае Хрысціна Глушко, значна больш беларусаў паехалі глядзець гэтую славутасць сем'ямі. А калі аднаўленне велічнага палаца працягваецца, значыць, інтарэс турыстаў будзе ўзрастаць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 36 (524)



## ПОШУК СЕКСУАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ, БУЛІНГ І ХАЛАКОСТ

### Што цікавіць сучасную падлеткавую літаратуру?

**У культурным цэнтры «Корпус» 27—28 лістапада адбыўся фестываль падлеткавай і young adult літаратуры. За два дні наведвальнікі «Корпуса» пабачылі спектаклі, паўдзельнічалі ў інтэрактыўных гульнях і паслухалі лекцыі. Свята арганізавалі каманды фестываля інтэлектуальнай кнігі «Pradmova» і праекта «ЗаЧтение».**

Увогуле, што такое young adult літаратура? Калі перакладаць даслоўна, то атрымаецца «літаратура для маладых дарослых». Строгага абазначэння тэрміну, калі гэтая «маладая дарослась» заканчваецца, — няма. Некаторые даследчыкі вылучаюць час паміж дваццаццю і дваццаццю адным годам. А вось арганізатары «YA (Я)»-фэсту запрашалі і тых чытачоў, якім зараз па дваццаць пяць гадоў. У young adult літаратуры адсутнічае жорсткая жанравая і ўзроставая градацыя, што дазваляе і пісьменнікам, і чытачам адчуваць сябе вольна.



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

На фестываль запрасілі маладых і вельмі цікавых спікераў. Адкрыўся фэст лекцыяй мастацтвазнаўца Мікіты Моніча аб кнігах па гісторыі мастацтва. Лектар расказаў аб літаратуры, якая падрыхтуе вас да наведвання музея: для гэтага трэба прачытаць кнігу Ондржэя Хробака, Расціслава Карычанека і Марціна Ванека «Як арганізаваны музей». Мікіта падкрэсліў, што беларуская музеі, на жаль, «зусім не friendly» да непадрыхтаваных гледачоў. Але для таго каб навучыцца ўспрымаць і разумець мастацтва, трэба рэгулярна з ім знаёміцца: «хадзіць на Ноч музеяў раз у год — гэта як мыцца толькі на Вялікдзень: вельмі карысна, але недастаткова», — падсумаваў мастацтвазнавец.

Вельмі карысная для ўсведамлення, што такое young adult літаратура, аказалася лекцыя Анастасіі Васілевіч «Драматургія для падлеткаў». Новая драма ставіць пытанні вельмі востра і адкрыта. Гэта датычыцца тэм і хатняга гвалту, і фемінізму, і экалагічнага стану планеты. Сучасная падлеткавая драматургія размаўляе з намі амаль такой жа рэзкай, максімальна набліжанай да рэчаіснасці мовай. Але тэмы, якія яна ўздымае, цікавыя як дзецям, так і дарослым. Падчас лекцыі Анастасія Васілевіч вылучыла падлеткавы гвалт, пошук сексуальнай, прафесійнай, сацыяльнай ідэнтычнасці, пытанні жыцця і смерці, сталенне як асноўныя тэмы падлеткавай драматургіі.

Падчас «YA (Я)»-фэсту можна было паўдзельнічаць у інтэрактыўнай віктарыне «О, Караткевіч», каб ацаніць уласнае веданне творчасці пісьменніка. Студыя дзіцячай мультыплікацыі «Энфіс» правяла майстар-клас па стварэнні пластылінавага мультфільма. У анімацыйнай тэхніцы, якая называецца «пластылінавая перакладка» і ў якой спрабавалі працаваць удзельнікі, быў створаны знакаміты мультфільм «Пластылінавая варона». Былі і спектаклі: тэатр лялек, свята і ценю «Дом Сонца» прадставіў пастаноўку паводле кнігі Сары Лундберг «Птушка ўва мне ляціць, куды захоча».

Фестываль зацікавіў наведвальнікаў самых розных узростаў. Арганізатары і спікеры паказалі, што сучасная падлеткавая літаратура мае вялікі тэматычны спектр, пачынаючы інтэрнэт-булінгам і заканчваючы Халакостам. А дзіцячая кніга — гэта, па сутнасці, складаны твор мастацтва: над ёй працуе не толькі аўтар, але і мастак. Атрымліваецца тандэм, дзе аднаго твору немагчыма ўявіць без іншага. Добры прыклад — серыя кніг аб прыгодах Мамы Му і яе сябра Крумкача.

Спадзяёмся, што ў наступным годзе «YA (Я)»-фэст вернецца з новай праграмай.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# «Мы жывём у такі цікавы час, калі кожны можа не толькі ўявіць сябе крытыкам, але і гучна назвацца ім у сацыяльных сетках»

**Нядаўна лаўрэатам прэстыжнай прэміі «Садружнасць дэбютаў» за 2019 год ад Беларусі стала паэтка Кацярына РОЎДА, супрацоўніца навукова-метадычнага аддзела Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Яна ж — кіраўнік клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа». Прэмія была заснавана ў 2008 годзе Саветам па гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў-удзельнікаў СНД. Асаблівасць сёлетняй прэміі ў тым, што ў СНД 2019 быў аб'яўлены Годам кнігі, і ўшаноўваліся спецыялісты ў галіне кніжнай культуры.**

**З-за неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкі Кацярына даведалася пра ўзнагароду ў анлайн-рэжыме, але віншаванні прагучалі самыя шчырыя.**



**— Віншую з прэстыжнай прэміяй! Наколькі я ведаю, з беларускіх літаратараў яе дыпламантам была паэтка Аксана Спрынчан. Фармулёўка тваёй узнагароды вельмі цікавая: за развіццё і папулярызацыю чытання... Шмат хто здзяйсняў падобныя праекты цягам 2019 года. Што незвычайнага ў тваіх праектах?**

— Ніколі не лічыла, што я раблю нешта настолькі адметнае, за што магла б прэтэндаваць на ўзнагароду такога ўзроўню. Да наступлення эпідэміі каранавіруса, як самастойна, так і з калектывам клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа», я з задавальненнем брала ўдзел у шматлікіх творчых мерапрыемствах. Клумбаўцы — гэта таленавітыя маладыя паэты і празаікі з БДУ, якія на працягу шасці гадоў плённа шчыруюць на ніве беларускай літаратуры. Выдадзена 15 аўтарскіх кніг, пастаўлена шэсць паэтычных спектакляў на ўласныя вершы, на творы ўлюбёных аўтараў, паспяхова рэалізаваны праект «Карані», які звяртаецца да літаратурнай і духоўнай спадчыны Беларусі. Дзякуючы падтрымцы адміністрацыі ФБ БДУ і нашага неверагоднага куратара Ірыны Шкіронак, на розных факультэтах універсітэта мы правялі віктарыны «Размаўляй па-беларуску», літаратурную вечарыну «Лістапад па-беларуску», падрыхтавалі калектыўны зборнік «Пад ветразем натхнення», здзейснілі некалькі падарожжаў па знакавых мясцінах краіны. У 31-ы дзень нараджэння, у маі 2019-га, я мела шчасце прэзентаваць сваю новую кнігу "Паэтычныя КаРункі". Былі яшчэ і работа на Міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, паэтычны аўтобус, Міжнародны фестываль еўразійскіх культур, Паэтычны форум... Для мяне «Радзіма», «мова», «кніга» — сінонімы слова «жыццё».

**— Сёння кажуць, што страчаны сам навык «павольнага» чытання, удумлівага, як і здольнасць атрымліваць асалоду ад стылю пісьменніка...**

— На жаль, як паказвае шалёны час і мая ўласная практыка, удумлівае «павольнае» чытанне — гэта, хутчэй, выключэнне, чым правіла. Сучасны чалавек настолькі спяшаецца, што іншы раз мы нават на СМС-паведамленні ад блізкіх людзей рэагуем са спазненнем або бегла чытаем і «клацаем» на смайлік, нешта, накшталт «ок». Штосьці падобнае здараецца і са знаёмствам з творамі літаратуры. Папулярныя тэхнікі хуткачытання, сайты са скарочанымі варыянтамі мастацкіх тэкстаў эканомяць час, але пазбаўляюць глыбокага пазнання аўтарскай задумы і той эстэтычнай асалоды, якую можна адчуць толькі ўважлівым вокам і чулым сэрцам.

**— Ці ўплывае сёння на папулярызацыю чытання, кнігі літаратурная крытыка?**

— Мы жывём у такі цікавы час, калі амаль кожны чалавек можа не толькі ўявіць сябе паэтам, празаікам або крытыкам, але і гучна назвацца ім, дэманструючы ў сацыяльных сетках свой «прафесіяналізм». Вельмі неадназначны ўплыў аказваюць на папулярызацыю чытання крытычныя артыкулы, якім уласцівы ананімнасць, правакацыйнасць, нядобразычлівасць. Бялінскі называў літаратурную крытыку «рухомай эстэтыкай». Ён слушна падкрэсліваў: тое, што скажуць пра вялікі твор літаратуры, не менш важнае за сам твор. Магу часткова пагадзіцца, але, на маю думку, найлепшы крытык — гэта час.

**— Адны сцвярджаюць, што ў эпоху інтэрнэту праблем з бібліятэчным абслугоўваннем вяскоўцаў проста не можа быць, пампуй ды чытай ці замаўляй у інтэрнэт-крамах. Іншыя бядуюць, што сельскія бібліятэкі зачыняюцца — хоць іх і замяняюць бібліябусамі, бо знікаюць культурныя асяродкі... Твой погляд на праблему?**

— Будзем шчырыя, нават пры наяўнасці добра наладжанага інтэрнэту далёка не кожны чытач (гарадскі ён жыхар ці вясковы) аддасць перавагу электроннай кнізе. Я, дарэчы, адношуся да аматараў той самай класічнай кнігі, старонкі якой можна пагартаць, адчуць не толькі іх змест, але і форму, лёгкі водар паперы. А калі ўлічыць той факт, што распаўсюджанасць якаснай інтэрнэт-сувязі, наяўнасць даступнай па цэнах камп'ютарнай тэхнікі, узровень умення ёю карыстацца (асабліва ў пажылых людзей) яшчэ не зусім адпавядаюць патрабаванням часу, то навіны пра сельскія бібліятэкі, якія зачыняюцца час ад часу, наводзяць сум і хваляванне за дзень заўтрашні. І тут ужо справа не толькі выключна ў перавагах метадаў чытання. Бібліятэка на вёсцы — гэта не проста кнігасховішча ды адзінокая жанчынка ў акулярах, што чытае часопіс ці перабірае фармуляры, каб не задрамаць. Бібліятэка — гэта ўтульны дом кнігі, які ва ўсе часы аб'ядноўваў разумных, цікавых, неабыякавых да сваёй культуры і маленькай радзімы людзей. Гэта гурткі па інтарэсах для школьнікаў, мерапрыемствы, прысвечаныя творчасці класікаў, падрыхтоўка да знакавых свят вёскі і раёна. Пералічваю і прыпамінаю сваю Адамоўскую бібліятэку, якая разам з мясцовым Домам культуры і школай, нібы тры кіты, трымалі на сабе, бадай што, самае галоўнае: адукацыю, духоўнае і эстэтычнае выхаванне, здольнасць аб'ядноўваць людзей. Школа... Клуб... Бібліятэка... Зачынены. Фонд пераехаў у раённы цэнтр. І мая вёска асірацела. І толькі час ад часу наводзяць сумную, але ўсё ж светлую ўсмешку ўспаміны з экскурсій па нашым школьным музеі «Беларуская хатка», якія мне даводзілася праводзіць у зусім яшчэ малыя гады пад чулым кіраўніцтвам найлепшай ў свеце настаўніцы роднай мовы і літаратуры Ганны Уладзіміраўны Садоўскай. Усплываюць у памяці непаўторныя галасы зямлячак-жанчын з мясцовай капэлы і мае, зусім яшчэ сціплыя, першыя паэтычныя спробы, якія я прыносіла паказаць у бібліятэку. Не было інтэрнэту і гаджэтаў, бацькі шмат працавалі, але было тое свята, да якога мы ўсе цягнуліся — свята кніг, ведаў, дабрыні. Шкада, што сёння самы распаўсюджаны пункт сустрэчы ў большасці нашых вёсачак, асабліва невялікіх, — гэта тое месца Z, куды ў дзень X прыязджае аўталаўка. У найлепшым выпадку — магазін. Там і культурныя справы абмяркоўваюцца, і мясцова-злабадзённыя. Час ад часу там абменьваюцца парадамі, рэцэптамі — і, што радуе, кнігамі з уласных дамашніх бібліятэк. Была — бачыла — ведаю.

**— Якую повязь адчуваеш з малой радзімай, якія праекты, можа, там ладзіш?**

— Ні для кога не сакрэт, што Валожынская зямля багатая на таленавітых людзей. З вялікай павагай стаўлюся да творцаў з літаратурна-мастацкага аб'яднання «Рунь», створанага на базе Валожынскага раённага Дома культуры (кіраўнік — Валянціна Францаўна Гіруць-Русакевіч). Хацелася б наведаць школы маленькай радзімы з прэзентацыяй маіх «Паэтычных КаРункаў», але COVID-19 пакуль дазваляе толькі чакаць і спадзявацца. А яшчэ я мару асабіста пазнаёміцца з аўтарам кнігі «Снежный барс», салісткай гурта «Ночные снайперы» Дзіянай Арбенінай, якая нарадзілася ў маім родным Валожыне. Веру, што ўсё наперадзе!

**— У вашай сям'і двое дзетак, чакаецца, наколькі я ведаю, трэцяе. Якім з'яўляецца ваша сямейнае чытанне? І ці пішаш для сваіх дзетак?**

— У сваё 32, калі я сама ўжо маці 11-гадовага сына, 5-гадовай дачушкі і так, чакаю нараджэння трэцяга дзіцяці, усё больш разумею, якой неверагоднай сілай нас і нашых родных надзяляюць любоў, падтрымка і ўвага. А чытанне, асабліва сумеснае, гэта вельмі прыгожая і эфектыўная прарава ўсяго пералічанага. Таму мы з мужам стараемся выхоўваць у дзецях павагу і беражлівыя адносіны да кніг. Радасна назіраць і за іх творчымі «праменьчыкамі». Напрыклад, Лёша любіць складаць казкі, апавяданні і песні, Палінцы лёгка даецца завучванне вершаў на памяць. Безумоўна, для і пра дзетак я пішу таксама, але на асобную кнігу новых вершаў яшчэ не назбірала. Усяму свой час. Толькі б ён быў добры, неба — мірнае, людзі — здаровыя!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ДЗЕЦІ АДНОЙ ЗЯМЛІ

## Чатыры сотні калекцыйных паштовак раскажуць пра добрасуседства беларусаў

**Днямі ў кнігарні «Дом кнігі «Светач» прэзентавалі новы альбом «Шматнацыянальная Беларусь» калекцыянера, лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА, які выдалі ў рамках праекта «У пошуках страчанага».**



— Кніга створана ў супрацоўніцтве з Міністэрствам інфармацыі, з якім мы плённа працуем з 2007 года. Ужо выйшла больш за 30 кніг у серыі «У пошуках страчанага» і праведзена больш за сотню выставак, у тым ліку і міжнародных. З усіх маіх кніг, безумоўна, мне складана вылучыць нейкую адну. Аднак кожная з іх была прысвечана пэўнай тэме, а хацелася стварыць нешта больш грандыёзнае і маштабнае, дзе змог бы паказаць усю краіну. І ў новай кнізе такая задумка рэалізавалася, — кажа Уладзімір Ліхадзедаў. — Альбом «Шматнацыянальная Беларусь» складаецца з дзвюх частак: першая расказвае пра нацыянальнасці, а другая — пра канфесіі. Значную падтрымку ў рэалізацыі задуманага аказаў і Гродзенскі выканкам, бо першапачаткова выхад кнігі планавалі прымеркаваць да правядзення фестывалю нацыянальных культур, аднак з-за эпідэміялагічнай абстаноўкі мерапрыемства перанеслі на наступны год, а выхад кнігі ўсё ж такі адбыўся...

Выданне расказвае не пра асобны горад ці мястэчка, а пра Беларусь увогуле і адну з найбольш характэрных для нашай краіны рыс — яе шматнацыянальнасць і шматканфесійнасць. Кніга вяртае нас на стагоддзе назад і паказвае, што і ў той час людзі жылі ў міры і згодзе: займаліся рамяством, дапамагалі адзін аднаму, шчыра працавалі, развівалі мірныя традыцыі продкаў, якія трэба захоўваць. У аснове альбома — больш за чатыры сотні паштовак і фотаздымкаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя з прыватнай калекцыі аўтара. Многія друкуюцца ўпершыню. Каментары да іх напісаны на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай. Дарэчы, выданне перамагло на міжнародным конкурсе «Мастацтва кнігі» краін СНД у намінацыі «Дыялог культур».

— Дадзенае выданне дазваляе ўсім нам пагледзець на дзень сённяшні праз прызму багатай гісторыі Беларусі і яе шматвекавых традыцый. За кожным фотаздымкам, за кожнай паштоўкай і сюжэтам у гэтай кнізе адчуваецца неймаверная сіла і энергія нашага роду і нашай зямлі, міралюбнасць, паважлівае стаўленне да іншых нацыянальнасцяў. Добрасуседства гістарычна з'яўляецца неад'емнай часткай прыроды беларусаў. Менавіта пра гэта і нагадвае ўсім нам новая кніга аўтара. Яна нібы вяртае свайго чытача да ўжо вядомай тэзы пра тое, што нас многа і мы розныя, аднак Беларусь у нас адна. І калі сучаснаму пакаленню беларусаў выпаў унікальны шанц стварыць першую ў гісторыі самастойную беларускую дзяржаву, то мы, безумоўна, павінны распарадзіцца гэтым шанцам належным чынам. І, канешне ж, вучыцца ў нашых продкаў паважаць адно аднаго, берагчы мір і спакой на роднай зямлі. Шанаваць тое, што было зроблена нашымі папярэднікамі, — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Сёння ў нашай дзяржаве мірна жывуць прадстаўнікі 156 нацыянальнасцяў і 25 рэлігійных канфесій. Кожная з іх узбагачае нашу культуру і духоўную спадчыну, фарміруе вобраз Беларусі як краіны, дзе рады



кожнаму, хто прыходзіць сюды з дабром. Менавіта такую Беларусь, добразычлівую, гасцінную, самабытную і шматгранную, вы зможаце знайсці на старонках выдання «Шматнацыянальная Беларусь».

Таксама на прэзентацыі была арганізавана выстаўка «Страчаная спадчына», дзе наведвальнікі мелі магчымасць убачыць унікальныя паштоўкі і фотаздымкі, многія з якіх існуюць у адным экземпляры. І дзякуючы гэтаму ажыццявіць своеасаблівае падарожжа ў найбольш каларытныя паселішчы, убачыць цэрквы, сінагогі, касцёлы, мячэці, якія на гэты час ужо зніклі, паглядзець на людзей, што жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя: беларусаў, рускіх, палякаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў, а таксама французаў, немцаў, нават кітайцаў і карэйцаў.

У сваю чаргу **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Уладзімір АНДРЫЕВІЧ** заўважыў, што беларуская талерантнасць шліфавалася вякамі, і ў гісторыі ёсць шматлікія факты, якія сведчаць пра тое, што мір і спакой вельмі важныя для кожнага з нас на генетычным узроўні:

— Шматнацыянальнасць і шматканфесійнасць — гэта адна з самых знакавых тэм у Беларусі. Калі гартаеш кнігу «Шматнацыянальная Беларусь», то адчуваеш не толькі подых часу, але і цяперашняе жыццё. Варта толькі праехаца па краіне — убачыш, як побач стаяць праваслаўная царква і касцёл, а непадалёк могуць быць і сінагога, і мячэць. Гэта якраз і характарызуе нашу Беларусь.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# З воску, бронзы і мелодыі

## Хто ўвекавечыць памяць Ігара Лучанка?

**Імя беларускага кампазітара, народнага артыста БССР і СССР, ганаровага грамадзяніна горада Мінска Ігара Лучанка ўпісана ў гісторыю айчыннай культуры яго шматлікімі творамі. Мелодыі песень, сярод якіх «Мой родны кут», «Спадчына», «Алеся», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Майскі вальс» і многія іншыя, пазнаюцца слухачамі розных пакаленняў з першых нот. На жаль, у 2018 годзе ва ўзросце 80 гадоў маэстра пайшоў з жыцця.**



Каб увекавечыць памяць кампазітара, Міністэрствам культуры быў аб'яўлены конкурс эскізных праектаў надмагільнага помніка. Журы спынілася на рабоце аўтарскага калектыву скульптараў Івана Міско і Аляксандра Фінскага, а таксама архітэктараў Віктара Крамарэнкі і Юрыя Мамліна. Канчатковы варыянт эскіза, у якім улічылі і заўвагі, і пажаданні сям'і Ігара Лучанка, зацвердзілі сёлета ў канцы лістапада. У ім перад намі Ігар Лучанок — такі, які быў у росквіце сіл, такі, якім яго і запомнілі прыхільнікі.

— Нам хацелася бачыць Ігара Міхайлавіча натхнёным, якім ён быў заўсёды, калі пісаў, выходзіў на сцэну. Бо ў гэткія моманты ён нібыта станавіўся іншым чалавекам. Мне вельмі хацелася, каб у яго вобразе паказалі гэты стан творчасці, — кажа жонка кампазітара Аляксандра Лучанок.

Калі зірнуць на эскіз, упэўнішся, што скульптарам удалося перадаць задуму. Вядома, у кожнага будзе сваё ўспрыманне, незалежна ад таго, ацэньвае вы работу як прафесіянал ці як просты глядач. Але калі я гляджу на скульптурную кампазіцыю, дзе галаву кампазітара ахінае, нібы крыло, нотны радок, мяне ўражвае перш за ўсё ягоны позірк. Здаецца, маэстра і ўзіраецца ў цябе, і адначасова напружана шукае ў прасторы патрэбны матыў. Потым ужо пачынаеш аналізаваць дэталі... Напрыклад, звяртаеш увагу на ноты. А гэта не проста элемент дэкору — а фрагмент мелодыі «Мой родны кут». Яго Ігар Лучанок любіў выкарыстоўваць, калі даваў аўтографы.

— Працуючы над эскізам, мы ўлічвалі пажаданні сям'і і калег Лучанка адносна таго, як павінен выглядаць Ігар Міхайлавіч, а таксама аналізавалі яго шматлікія фотаздымкі розных гадоў. І ўсюды ён розны. Таму гэтую работу не варта разглядаць як фотадакумент, бо гэта абагульнены вобраз кампазітара, музыканта, які мае свой настрой. Тут чытаецца натхненне, унутраны творчы палёт, — дзеліцца скульптар Іван Міско.

Івана Акімавіча звязвае з Ігарам Лучанком вялікае сяброўства, якое неаднойчы натхняла скульптара тварыць з натуры. Напрыклад, ён рабіў накіды бюста кампазітара і зняў маску яго правай рукі, а вось зняць маску з твару так і не паспеў, бо важна было знайсці правільны момант і настрой...

У творчым саюзе стваральнікаў надмагільнага помніка скульптар Аляксандр Фінскі — фігура таксама невыпадковая, бо, як адзначае сам творца, з Ігарам Лучанком яны, лічы, землякі. Яшчэ ён ствараў памятную дошку, якую ў свой час устанавілі на доме ў Мар'інай Горцы, дзе кампазітар жыў з бацькам.

— Для мяне гэтая работа асаблівая тым, што Ігара Міхайлавіча я лічу сваім мар'інагорскім земляком. Менавіта там кампазітар правёў сваё дзяцінства, сталеў і фарміраваўся як асоба, таму і лічыў тое месца сваёй радзімай, — расказвае скульптар. — І для мяне было гонарам спрычыніцца да стварэння помніка гэтаму вялікаму чалавеку. Што да фрагмента мелодыі, то ў мяне ёсць кніга з песнямі, якую Ігар Лучанок некалі падпісаў, і там якраз і занатаваны яго рукой ноты песні «Мой родны кут». Я адразу прапанаваў узяць яго факсіміле гэтай фразы, і ўсе пагадзіліся.

Тое, што Ігар Міхайлавіч быў унікальны меладыст, ведаюць усе. А мелодыя — гэта ж аснова любога музычнага твора, таму і ў кампазіцыі помніка яна — вельмі моцны сімвал той шматграннай і багатай творчай спадчыны, якую пакінуў нам Ігар Лучанок. Зараз работа над помнікам працягваецца. Пасля таго як зробяць фармоўку, эскіз пойдзе на завод, дзе яго адальюць з воску, і тады скульптары будуць прапрацоўваць варыянт помніка ў воску і ў бронзе. Гатовы помнік будзе ўстаноўлены на магіле кампазітара на Усходніх могілках у Мінску.



Сёння таксама застаецца актуальнае пытанне аб тым, як будзе ўвекавечана памяць Ігара Лучанка ў сталіцы і на яго радзіме. Ці з'явіцца, напрыклад, парк або вуліца імя кампазітара — а можа, адкрыецца адмысловы фонд? Іван Міско канстатуе — пакуль ініцыятывы на гэтую тэму ніхто не праяўляе:

— Была створана камісія па ўвекавечванні памяці Ігара Лучанка, якая ні разу не сабралася і не агучыла ніякіх прапаноў. На малой радзіме, напрыклад, іх чакаюць, аднак ці прагучаць яны, і хто гэта зробіць?

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

## Дар'я ХАМУЦЯНСКАЯ:

# «На корце сяброў няма»

## Закаханая ў тэніс

**Дар'я Хамуцянская — 16-гадовая тэнісістка, якая рыхтуецца заявіць аб сабе на ўвесь спартыўны свет. У яе планах — стаць лепшай за Арыну Сабаленку. Дзеля гэтага яна не баіцца новых ідэй, рашэнняў і руплівай працы. Пацверджанне таму — шматлікія поспехі Дар'і на юніёрскіх турнірах, якія праходзілі пад эгідай Міжнароднай федэрацыі тэніса. Узыходзячая зорка беларускага тэніса расказала «Звяздзе», які ён, шлях да спартыўных вышынь.**



**— Дар'я, чаму ты абрала для сябе менавіта тэніс?**

— А я яго не выбірала. Бацькі прывялі мяне ў секцыю, калі мне было пяць гадоў, і спачатку я не разумела, чаго ад мяне хочуць і што я павінна рабіць. Сказалі бегчы — я пабегла. Але калі мне ўпершыню ў рукі далі ракетку, я сама пачала набіваць мяч, нібы ведала, як гэта трэба выконваць. Трэнеры адзначалі, што ў мяне ёсць патэнцыял. І з цягам часу я сама захапілася тэнісам і пачала да яго больш сур'ёзна ставіцца. У мяне спартыўная сям'я. Мама калісьці займалася гімнастыкай, а тата — прафесійным тэнісам, але траўма перашкодзіла пабудаваць спартыўную кар'еру. Таму, мабыць, бацькі вырашылі, што з мяне можа вырасці прафесійная спартсменка.

**«Мы ўсе працуем, каб кожны дзень станавіцца лепшымі».**

**— Памятаеш свае першыя спаборніцтвы?**

— Канешне, гэта быў турнір у Мінску сярод тэнісістаў да васьмі гадоў. Я тады заняла другое месца, прайграўшы толькі дзяўчынцы з Бабруйска, але праз два гады я яе абыграла. А першы міжнародны турнір быў у Пінску, і там я таксама заняла другое месца.

**— Якое сваё дасягненне ты лічыш самым важным у кар'еры?**

— Дасягненняў шмат, але вылучыць адно мне цяжка. Мабыць, адзначу сваю перамогу на двух турнірах ITF (Міжнароднай федэрацыі тэніса. — заўв. «**Зв.**») запар. Гэтыя спаборніцтвы праходзілі ў Мінску год таму. Я стала абсалютнай чэмпіёнкай турніру BelGlobalCup — перамагла ў адзіночным і ў парным разрадах. А праз тыдзень на турніры BelGlobalGarantCup у першым крузе прайграла ў пары і заваявала тытул у адзіночным разрадзе. Гэта, безумоўна, значнае дасягненне, але не самы яркі момант у кар'еры.

**— А які самы яркі момант у тваёй кар'еры?**

— Пераезд з Гомеля ў Мінск. У 2018 годзе стала зразумела, што ў Гомелі я дасягнула свайго максімуму і для развіцця кар'еры варта пераехаць у Мінск. Спачатку я трэніравалася ў Ірыны Ігараўны Хрыпач. У той час у маёй гульні быў невялікі спад, але на чэмпіянаце Беларусі я павінна была спаборнічаць з дзяўчатамі 16 гадоў. Я была самая малодшая, таму ні на што не разлічвала. Але здарыўся нейкі ўзлёт, і я дайшла да фіналу. У барацьбе за першае месца я прайграла, аднак лічу той эпізод між́ вызначальным. Акрамя таго, я, па сутнасці, перавезла сям'ю ў Мінск. Спачатку я пераехала адна, жыла ў інтэрнаце, дзе мне было вельмі некамфортна і ўсё не падабалася. Праз два месяцы ў Мінск пераехала мама і мы знялі кватэру, потым бабуля да нас прыехала. Толькі тата застаўся ў Гомелі, бо ён не можа пакінуць работу.

**— Табе больш камфортна выступаць у пары ці ў адзіночцы?**

— Дакладна ў адзіночным разрадзе. У пары я адчуваю адказнасць за партнёрку, я павінна яе падтрымліваць, дапамагаць. А калі я гуляю адна, я канцэнтруюся на сваіх адчуваннях і сваіх дзеяннях. Часцей за ўсё я гуляю ў пары з Машай Сцяцэвіч, мы пастаянна выступаем разам на турнірах. Калі добрыя адносіны па-за кортам, праблем з разуменнем і падтрымкай падчас гульні не будзе. Могуць узнікнуць пытанні з тактыкай, таму што патрэбна адначасова адчуваць і сапернікаў, і партнёра. Я пакуль не маю вялікага вопыту ў парных выступленнях, але разумею, што галоўнае — камунікацыя паміж партнёрамі.

**— З Машай Сцяцэвіч у вас добрыя адносіны?**

— Мы найлепшыя сяброўкі, таму нам камфортна гуляць у пары. Зараз Маша залечвае траўму. Быў час, што мы гулялі адна супраць другой. Часцей за ўсё перамагала я, але ў апошні раз выйграла Маша і я хачу ўзяць рэванш. Канешне, пасля матча хтосьці з нас засмучваецца, але ні ў якім разе не крыўдзіцца. Мы добра разумеем, што на корце сяброў быць не можа.

**— На тваю думку, тэніс — сяброўскі спорт?**

— Усё ж такі тэніс — індывідуальны спорт, гэта звязана з яго спецыфікай. Большасць спартсменаў выступае ў адзіночным разрадзе і адстойвае свае інтарэсы. Ёсць камандныя турніры, самыя вядомыя — Кубак Дэвіса ці Кубак Федэрацыі, дзе тэнісісты выступаюць за каманду і гэта можа аб'яднаць людзей. Але ж на корт пераважна выходзяць па адным.

**— А мікс ты калі-небудзь гуляла?**

— Канешне, гэта і цікава, і страшна адначасова. Цікава таму, што трэба знайсці агульную мову з партнёрамі з дзяўчатамі гэта зрабіць прасцей, чым з хлопцамі. А страшна таму, што сапернік-хлопец можа моцна ўдарыць, а я не паспею падставіць ракетку ці адбегчы і буду сіняк. У мяне ўжо былі сінякі і на сцёгнах, і ў жывот мячом пападалі. Мікс гуляць яшчэ і весела, можна нават крыху расслабіцца, бо прымаць асноўныя рашэнні я давяраю мужчыну.

**— Дар'я, многіх тэнісістаў ведаюць па іх стылі гульні. Які стыль тваёй гульні — агрэсіўны ці спакойны?**

— У мяне штосьці сярэдняе паміж агрэсіўным і спакойным стылем, я камбінаваны ігрок. Усё залежыць ад саперніка. Я аднолькава магу атакаваць ці сыходзіць у абарону. Галоўнае — падабраць стыль пад саперніка. Часам прыходзіцца доўга думаць і праз гэта прайграваць першы сэт, а потым ужо перамагаць. У мяне такое часта здараецца. Гэта не трэнерская тактыка, яно само так атрымліваецца. Я выходжу на корт і разумею, што трэба рабіць, камбінацыі самі прыходзяць у галаву. Мабыць, у гэтым і заключаецца мой тэнісны талент.

**— Дарэчы, раскажы, калі ласка, пра свайго трэнера.**

— Я працую з Вадзімам Дзмітрыевічам Дзямбоўскім толькі з красавіка гэтага года. Ён вельмі добры чалавек і мне камфортна з ім працаваць, у нас выдатная камунікацыя. Канешне, у спорце павінна быць дысцыпліна і, калі трэба, ён можа насварыцца. Але мы ўсё вырашаем праз дыялог без ціску і крыкаў. Я не магу нармальна працаваць, калі на мяне пастаянна сварацца, гэта вельмі ўплывае на ўнутраны стан. Адкрытаму трэнеру можна расказаць пра свае спартыўныя праблемы і разам іх вырашыць, каб быць яшчэ лепшым гульцом. Магчыма, у будучыні я сама стану трэнерам, дзяліцца вопытам — гэта цудоўна.

**— З кім з вядомых ігракоў ты хацела б сустрэцца на корце?**

— З многімі. Дакладна з тэнісісткамі, якія ўваходзяць у топ-10 сусветнага рэйтынгу. З Каралінай Вазняцкі хацела б сустрэцца, хоць яна ўжо і скончыла кар'еру. Мне падабаецца польская тэнісістка Агнешка Радванска, якая таксама ўжо не выступае. Канешне, хацелася б сустрэцца з Вікторыяй Азаранкай, спадзяюся, што такая сустрэча можа стаць рэальнасцю.

**— Дар'я, што ты можаш адказаць людзям, якіх цікавіць пытанне, навошта займацца тэнісам?**

— Калі б я займалася тэнісам непрафесійна, я б адказала, што дзеля падтрымкі фізічнай формы. Тэніс патрабуе вялікай фізічнай актыўнасці і прыносіць задавальненне. А з пункту гледжання спартсмена — мне тэніс даў імкненне да перамог і развіў мэтанакіраванасць. Мы ўсе працуем, каб кожны дзень станавіцца лепшымі. Я хачу займацца тэнісам і перамагаць, таму я прысвячаю яму амаль увесь свой час.

**— Ты можаш уявіць сябе ў іншым відзе спорту?**

— У настольным тэнісе магу ўявіць. Я б ніколі не займалася гімнастыкай і ўсім іншым, што звязана з расцяжкай, гэта не маё. Магчыма, я б хацела паспрабаваць сябе ў камандных відах спорту, мне цікавы баскетбол.

**— У чым сакрэт тваёй матывацыі?**

— Мая матывацыя — гэта мама, якая заўсёды мяне падтрымлівае. Я хачу, каб яна бачыла мае вынікі і як я дасягаю мэт. Я хачу, каб яна за мяне радавалася і мной ганарылася, каб не нервы і труды не былі марныя. І, вядома, мне дзеля самой сябе хочацца дасягаць поспехаў у любімай справе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

**Россонский районный исполнительный комитет Витебской области (далее – Россонский райисполком)**

**ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС**

**по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса для организации промыслового лова, любительского лова на безвозмездной основе**

Конкурс состоятся **05 января 2021 г. в 15.00** по адресу: Витебская обл., г. п. Россоны, ул. Советская, 4, кабинет № 83 (кабинет первого заместитель председателя – начальника управления по сельскому хозяйству и продовольствию райисполкома).

Объектом конкурса является: озеро Вальковское, лещево-щучье-плотвичного класса, 269,2 га, расположенное на границе Россонского района (Витебская область) и Псковской области (Россия) 8 км на северо – запад от г. п. Россоны, 1,5 км на север от д. Глоты (далее – рыболовные угодья).

Срок заключения по результатам конкурса договора аренды рыболовных угодий составляет 10 лет.

**Начальная цена предмета конкурса** составляет 1453,68 белорусских рубля (одна тысяча четыреста пятьдесят три рубля шестьдесят восемь копеек).

**Условиями конкурса являются:**

1. Оформить право пользования земельными участками на берегу озера Вальковское для организации стоянок и мест отдыха.

2. Обустройство двух зон отдыха общего пользования с предварительной разработкой и согласованием эскиза.

3. Ведение рыболовного хозяйства путем промыслового лова, проведение любительского рыболовства на безвозмездной основе.

4. Запрещается:

проведение работ, связанных с изменением естественного ландшафта и существующего гидрологического режима, кроме работ по его восстановлению

расчистка прибрежной и водной растительности в прибрежной полосе;

применение ядохимикатов, в том числе уничтожение надводной растительности с применением гербицидов;

выжигание сухой надводной растительности, за исключением выполнения научно обоснованных работ по выжиганию сухой растительности и ее остатков на корню, тростника, камыша и других зарослей дикорастущих растений;

в гнездовой период (1 апреля – 1 августа) хозяйственная деятельность, приводящая к беспокойству птиц, гибели гнезд и кладок, охота, изменение уровня воды, а также промысловый лов рыбы и использование плавучих средств с моторами на расстоянии 50 м от полосы тростников.

**Размер задатка** для участия в аукционе оплачивается до подачи заявления в комиссию и составляет 436,1 белорусского рубля (четыреста тридцать шесть рублей 1 копейка), или 30 процентов начальной цены предмета торгов. Задаток перечисляется на расчетный счет Россонского райисполкома BY03 AKBB 3604 0000 0563 3210 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск БИК AKBBBY2X, УНП 300009816, ОКПО 04062995, наименование платежа: задаток для участия в торгах в форме конкурса.

**К заявлению прилагаются:**

комплексный план использования рыболовных угодий, разработанный в соответствии с требованиями к его содержанию и форме, установленными Советом министров Республики Беларусь, или его копия, запечатанные в отдельном конверте;

предложения в письменной форме о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте. Данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе конкурса;

копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;

доверенность представителя участника конкурса и копия документа, подтверждающего его личность (в случае если заявление подписывается не руководителем участника конкурса), либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя частника конкурса;

выписка банка о наличии денежных средств на банковском счете на первое число месяца, предшествующего дню подачи заявления, либо на первое число месяца подачи заявления;

биолого-экономическое обоснование, согласованное с Министерством сельского хозяйства и продовольствия и территориальными органами министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды, или рыбоводно-биологическое обоснование, имеющее положительное заключение государственной экологической экспертизы и утвержденное Министерством сельского хозяйства и продовольствия (абзац введен постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13 августа 2019 № 535).

К участию в конкурсе допускаются юридические лица, подавшие в комиссию заявление с вышеуказанным перечнем документов не позднее 17.00 31 декабря 2020 года, заявление об участии в торгах и заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение суммы задатка.

Участник конкурса имеет право до начала торгов письменно отозвать заявление об участии в конкурсе. При этом ему в течение пяти рабочих дней со дня обращения в комиссию возвращается сумма задатка.

Участнику, выигравшему конкурс, сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору аренды рыболовных угодий, заключаемому по результатам конкурса, при плате за рыболовные угодья.

Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса, в том числе расходов, связанных с разработкой и предоставлением участникам конкурса документации, необходимой для их проведения, осуществляется участником конкурса, выигравшим конкурс.

Участнику, не выигравшему конкурс, а также в иных случаях, предусмотренных законодательством, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Окончательный срок приема заявлений** об участии в конкурсе 31 декабря 2020 г. до 17.00.

Если аукцион признается несостоявшимся из-за того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, договор аренды рыболовных угодий заключается с этим участником при его согласии по начальной цене объекта конкурса, увеличенной на 5 процентов.

Участник, ставший победителем аукциона, после его окончания обязан подписать протокол аукциона в день проведения, возместить затраты на организацию и проведение торгов в форме аукциона, в течение трех дней со дня проведения торгов уплатить цену предмета торгов в полном объеме.

Документы на участие в торгах принимаются комиссией по адресу: Витебская обл., г. п. Россоны, ул. Советская, д. 4, кабинет № 84 (кабинет первого заместителя председателя – начальника управления по сельскому хозяйству и продовольствию райисполкома) в рабочие дни с 8.00 до 17.00 с перерывом на обед с 13.00 до 14.00. Контактный телефон/факс: 8 (02159) 5-13-93.

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения, о чем извещает участников торгов.

**ОАО «КЛИМОВИЧСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»**

**сообщает, что 23.12.2020 года состоятся вторые повторные электронные торги по продаже имущества ОСП «Подсобное хозяйство» ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод» одним лотом, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Климовичи и Могилевская область Климовичский район.**

Информацию об условиях проведения электронных торгов можно уточнить на сайтах **torgi.gov.by** и **bankrot.gov.by.**

УНП 700103211

В **суд Первомайского района г. Витебска** поступило заявление отдела по образованию администрации Первомайского района г. Витебска о признании безвестно отсутствующим ПАШКЕВИЧА Дмитрия Александровича. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Пашкевиче Дмитрие Александровиче, 04.12.1980 года рождения, последнее место жительства г. Витебск, проспект Строителей, 12-59, сообщить об этом суду Первомайского района г. Витебска в течение двух месяцев со дня опубликования данного сообщения по адресу: г. Витебск, ул. Горбачевского, 26, каб. 32, либо по телефонам 60 16 58, факс 22 95 55.

УНП 300049762

# Аперацыя «вакцынацыя»



## Што зменіць у свеце прышчэпка ад «кароны»?

**Сёння ў расійскай сталіцы пачалася вакцынацыя ад COVID-19. Першыя вакцыну атрымаюць супрацоўнікі сферы адукацыі, аховы здароўя і гарадскіх сацыяльных службаў, паведаміў мэр горада Сяргей Сабянін. У Маскве створаны ўвесь тэхналагічны і арганізацыйны ланцужок вакцынацыі — падрыхтаваны склады для захоўвання «Спадарожніка V», рэфрыжэратары для транспарціроўкі вакцыны. Усяго на вакцынацыю жыхароў сталіцы будзе выдзелена каля 134 мільёнаў долараў. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін даручыў пачаць масавую вакцынацыю на наступным тыдні. Шэраг краін таксама прыступае да такіх мер. Вялікабрытанія ўхваліла для прымянення вакцыну ад каранавіруса і мае намер днямі пачаць рабіць першыя прышчэпкі. Аднак брытанскі прэм'ер-міністр Борыс Джонсан заклікаў не паддавацца спакусе і памятаць, што для масавай вакцынацыі спатрэбіцца час — асабліва з улікам таго, што прэпарат трэба захоўваць пры тэмпературы мінус 70 градусаў, а для фарміравання імунітэту патрабуюцца дзве ін'екцыі з перапынкам у тры тыдні. «Сітуацыя для некаторых сектараў будзе складаная», — папярэдзіў Джонсан. Што зменіць у свеце прышчэпка ад «кароны»?**

### ГРОШАЙ УСЁ МЕНШ

З'яўленне адразу некалькіх вакцын падбадзёрыла змучаныя каранавірусам краіны. Прышчэпкі абяцаюць у недалёкай будучыні вяртанне да нармальнага жыцця пасля шматмесячных лакдаўнаў. Але ці выратуюць яны сусветную эканоміку ад найбуйнейшага крызісу стагоддзя? Маштабны крызіс спыніў шматгадовы прырост багацця ў свеце, адкінуў большасць краін на некалькі гадоў таму і ўжо абышоўся падаткаплацельшчыкам у 12 трыльёнаў долараў, паведаміла Бі-бі-сі. Выдаткоўваць сродкі на антыкрызісныя меры давядзецца і надалей, нягледзячы на тое што даходы скарачаюцца: свет недалічыцца 28 трыльёнаў долараў цягам найбліжэйшай пяцігодкі, падлічыў Міжнародны валютны фонд.

Грошай на жыццё і развіццё застаецца ўсё менш, а даўгі растуць — эксперты падлічылі, што сёлета тыя павялічацца яшчэ на 20 трыльёнаў долараў і перавысяць гадавы аб'ём сусветнай эканомікі ў тры з паловай раза. Паколькі прычына гэтага крызісу адна — вірус, навіны пра з'яўленне некалькіх эфектыўных вакцын выклікалі прыліў аптымізму ў фінансавых рынках. Тыя, у каго ёсць грошы, зрабілі стаўкі на будучы рост даходаў бізнесу і насельніцтва. Больш стрымана адрэагавалі эканамісты, чыноўнікі і кіраўнікі цэнтральных банкаў — тыя, хто адказвае за фінансавую стабільнасць і выдзяляе антыкрызісную дапамогу, заўважыла Бі-бі-сі.

Кіраўнік амерыканскага Цэнтрабанка — Федэральнай рэзервовай сістэмы — Джэром Паўэл — самы ўплывовы і асцярожны банкір у свеце, здольны адным словам абрынуць сусветныя рынкі, назваў вакцыну «добрай і доўгачаканай навіной», але агаварыўся: яна акажа ўплыў на эканоміку ў сярэднетэрміновай перспектыве, а не ў найбліжэйшы час. Яго калегі ў Еўропе — другой пасля ЗША найбуйнейшай сусветнай эканомікі — таксама не спяшаюцца абвяшчаць заканчэнне глабальнага крызісу. «З'яўленне вакцыны мяняе ўяўленне пра тое, як будзе развівацца сітуацыя бліжэй да канца наступнага года і ў 2022-м, а не ў найбліжэйшыя паўгода», — сказаў ірландскі эканаміст Філіп Лейн, які засядае ў савеце еўрапейскага ЦБ.

З банкірамі згодная кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду Крысталіна Георгіева. У пасланні лідарам краін «вялікай дваццаткі» яна адзначыла восеньскае запаволенне эканомікі, якая перад гэтым акрыяла ўлетку. Віной усяму другая хваля пандэміі. «Медыцынскае рашэнне праблемы ўжо праглядаецца, а вось шлях да эканамічнага аднаўлення па-ранейшаму цяжкі і багаты на зрывы», — папярэджвае кіраўнік МВФ.

### СВЯТЛО Ў КАНЦЫ ТУНЭЛЯ?

Выходзіць, прышчэпка не ўратуе сусветную эканоміку ад крызісу, пакуль не пачнецца масавая вакцынацыя? Зусім неабавязкова, сцвярджаюць тыя эканамісты, у якіх шклянка напалову поўная, іранізуе Бі-бі-сі. «Ёсць і добрыя навіны, напрыклад, аб'яўленне аб адабрэнні некалькіх вакцын. З гэтага




пункту гледжання ўжо відаць святло ў канцы тунэля», — заўважыў адзін з кіраўнікоў Еўрапейскага цэнтрабанка Фабіа Панэта. Тымі ж словамі выказаўся амерыканскі эканаміст Джэймс Балард, які ўзначальвае адзін з федэральных рэзервовых банкаў у ЗША: «Падобна на тое, што ў канцы тунэля з'явілася святло. Выхад з крызісу бачны, цяпер гэта ўжо вельмі рэалістычны пункт гледжання на сітуацыю».

Аптымізму ім дадае той факт, што вакцына дабратворна ўплывае на эканоміку задоўга да таго, як ліквідуе асноўную прычыну крызісу — пандэмію. І вось чаму. Дзелавая актыўнасць падаўлена, паколькі бізнес і людзі страцілі ўпэўненасць у будучыні (што прымушае іх менш траціць), а ўлады баяцца бескантрольнага распаўсюджвання віруса (што прымушае іх уводзіць лакдаўн). Наяўнасць вакцыны зводзіць гэтыя дзве небяспекі на нішто яшчэ да таго, як вакцынацыя стане масавай.




Прышчэпка дае надзею людзям і бізнесу на тое, што новага каранціну ўжо не будзе. Яны пачынаюць траціць сэканомленае за час каранціну і адкладзенае на чорны дзень, што павялічвае спажыванне. І зноў укладваюцца ў будучыню (пашыраюць свае праекты, купляюць нерухомасць), што падганяе інвестыцыі.

Спажыванне і інвестыцыі — два галоўныя складнікі эканамічнага росту. Менавіта яны пацярпелі ў гэты крызіс больш за ўсё. Два другія — гандаль і вытворчасць — скараціліся не так моцна, а з лета і зусім бадзёра аднаўляюцца. У цэлым вакцына дазволіць скараціць страты ад бягучага крызісу ў свеце на дзевяць трыльёнаў долараў у найбліжэйшыя пяць гадоў, падлічыў МВФ.

### АДКЛАДЗЕНЫ АПТЫМІЗМ

Аднак на шляху да святла сусветнай эканоміцы прыйдзецца ўжо гэтай зімой яшчэ раз спатыкнуцца ў цёмным тунэлі, папярэджваюць тыя, у каго шклянка напалову пустая, заўважае Бі-бі-сі. Віной таму — другі лакдаўн у Еўропе і неўтаймаваная другая хваля пандэміі ў ЗША.

На Амерыку і Еўрасаюз прыпадае больш за трэціну ўсяго багацця ў свеце. Яны — галоўная крыніца плацежаздольнага попыту і інвестыцый на планеце, і таму ад іх дабрабыту залежыць здароўе ўсёй сусветнай эканомікі. Без іх краіны, якія перамаглі пандэмію, перш за ўсё Кітай, не змогуць «адыграць» страты ў поўнай меры, хоць і вернуцца да росту ўжо ў гэтым годзе.

І тут навіны няважныя. Пакуль свет гучна святкаваў вакцыну за вакцынай, эканамічная статыстыка ціха і ўпарта пацвярджала словы кіраўніка МВФ аб тым, што выздараўленне будзе суправаджацца рэцыдывамі крызісу. У 19 еўрапейскіх краінах, дзе абарачаецца агульная валюта еўра, намеціліся прыкметы новага спаду. Гэта паказаў штомесячны аналіз настрояў насельніцтва і бізнесу, апублікаваны на мінулым тыдні. У ЗША аналагічная сітуацыя — у лістападзе чаканні росту змяніліся песімізмам. Праўда, амерыканцаў апытвалі яшчэ да абвяшчэння аб трыумфе фармацэўтыкі.

Эканамісты Bloomberg Economics прадказваюць эканоміцы, якая ледзь аднавілася, чарговую рэцэсію. Іх высновы пацвярджае бізнес, які найбольш пацярпеў ад каранакрызісу. Другая хваля і лакдаўн 2.0, які паралізаваў Еўропу, пагоршылі пакуты крамаў, рэстаранаў, гасцініц і перарвалі аднаўленне цэлых галін накшталт турызму або індустрыі забаў. «Эканоміка не адновіцца цалкам, пакуль людзі пазбягаюць натоўпу», — папярэджвае галоўны банкір свету Джэром Паўэл.

Свежае апытанне насельніцтва і бізнесу ў еўразоне развеяла надзеі на хуткае адраджэнне спажывецкага попыту — галоўнай рухаючай сілы развітых эканомік. У лістападзе яно ўпершыню з вясны паказала спад. Галоўная праблема — няўпэўненасць спажыўцоў у будучыні. Яна абвастрылася, нягледзячы на вакцыну, паколькі паступова, але ўпэўнена, у Еўропе матэрыялізуецца адкладзенае наступства любога эканамічнага крызісу — беспрацоўе. Хоць эканоміка Старога Свету ўпала не менш за амерыканскую, усплёск беспрацоўя ў Еўропе аказаўся больш сціплы, чым у ЗША. Уся справа ў фінансавым допінгу.

Краіны ЕС штучна падтрымлівалі грашыма занятасць і бізнес у цэлым. І як толькі ўлады пачнуць згортваць гэтыя праграмы разам з лакдаўнам, без дзяржпадтрымкі выжывуць не ўсё. Нездарма ў згаданым даследаванні чаканняў бізнесу і спажыўцоў у еўразоне індэкс занятасці пагаршаецца другі месяц запар, паказваючы на будучы ўсплёск беспрацоўя і, адпаведна, скарачэнне спажывання.

### УРОН НА ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

Хуткасць выхаду з крызісу будзе залежаць ад гатоўнасці і здольнасці ўладаў працягнуць падтрымку эканомікі — са сродкаў падаткаплацельшчыкаў і ў доўг. З гэтым паўсталі праблемы. У Амерыцы новы трыльённы антыкрызісны пакет затрымаўся ў кангрэсе па меншай меры да інаўгурацыі прэзідэнта, якая мае адбыцца ў канцы студзеня. А ў Еўропе антыкрызісны бюджэт памерам два трыльёны еўра ўпёрся ў спрэчкі з Польшчай і Венгрыяй.

І нават калі грошы знойдуцца, пра вяртанне да нармальнага жыцця і выхад з крызісу можна будзе казаць толькі тады, калі каранавірус з чумы XXI стагоддзя ператворыцца ў штодзённае захворванне накшталт грыпу. І лепш, калі гэта здарыцца раней, чым праблемы насельніцтва і бізнесу прывядуць да эканамічнага да фінансавага крызісу, папярэдзіў еўрапейскі ЦБ.

У Амерыцы сітуацыя яшчэ больш складаная, чым у Еўропе. Акрамя палітычнага абвастрэння з-за выбараў ЗША перажываюць не спад, а рост колькасці заражэнняў. «Вірус распаўсюджваецца з вялікай хуткасцю, і наступныя некалькі месяцаў будуць вельмі няпростыя», — сказаў кіраўнік амерыканскага Цэнтрабанка Джэром Паўэл.

Хутка вярнуцца да дакрызісных тэмпаў росту і пачаць адбіваць недаатрыманыя за час хваробы 28 трлн долараў не атрымаецца. «Поўнае аднаўленне ВУП да ўзроўняў 2019-га не адбудзецца да восені 2022-га, — падзяліўся прагнозамі з Бі-бі-сі Філіп Лейн з ЕЦБ. — Мы не думаем, што ўсё раптам зноў стане так, як было да COVID-19. Таму што пандэмія акажа доўгатэрміновы ўплыў на спажывецкі давер, зберажэнні і занятасць. Вакцына гэтаму не дапаможа». «Нават пры самым аптымістычным раскладзе масавая вакцынацыя зойме шмат часу, — пагаджаецца яго калега Фабіа Панэта. — А яшчэ больш часу трэба на тое, каб насельніцтва паверыла, што ўсё прайшло». Іншымі словамі, нас чакае яшчэ адзін «год пандэміі» ў 2021-м».

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш папярэдзіў аб доўгатэрміновых наступствах пандэміі. Вакцына ад SARS-CoV-2 не вырашыць усе праблемы, заявіў генсек на адкрыцці віртуальнага саміту ААН, які прайшоў днямі. «Не будзем цешыць сябе. Вакцына не ліквідуе ўрон, які застанецца на гады, а можа, і на дзесяцігоддзі», — заўважыў ён. Па словах Гутэрыша, у свеце расце ўзровень галечы, пагроза голаду. Генеральны сакратар ААН заклікаў дзяржавы забяспечыць аднолькавы доступ да вакцын ад каранавіруса ва ўсім свеце, якія ён назваў «глабальнай грамадскай дабротай».

**Захар БУРАК.**





# БНТУ СПАЎНЯЕЦЦА 100 ГАДОЎ

## ВНУ, розумам і працай выпускнікоў якой у многім пабудавана сучасная Беларусь

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета быў адкрыты новы кірунак спецыяльнасці «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» — «Эканамічная бяспека прамысловага прадпрыемства». Ён, дарэчы, унікальны для ўсёй СНД. Таксама ў бягучым годзе будзем працаваць па актуалізацыі спецыяльнасці «Тэхналагічнае абсталяванне машынабудаўнічай вытворчасці».

Для нас важна забяспечыць кожнага свайго выпускніка першым рабочым месцам. Прыемна, што ў нас штогод стопрацэнтнае размеркаванне бюджэтнікаў. Першае рабочае месца знаходзім і платнікам. На сёння бачым, што ў праграму навучання трэба больш актыўна ўкараняць дысцыпліны, звязаныя з лічбавізацыяй. Цяпер у кожную спецыяльнасць прыйшлі інфармацыйныя тэхналогіі, — складаныя інжынерныя праграмныя прадукты, якія неабходна асвоіць. Зразумела, гэта не кажа пра тое, што тэхналогіі, якія былі распрацаваны сто гадоў таму, застануцца з намі цяпер і ў будучыні. Яны зменяцца, і гэтаму мы будзем вучыць нашых студэнтаў.

БНТУ — адзін з нямногіх універсітэтаў, які ўваходзіць у спісы розных сусветных рэйтынгавых сістэм, што сведчыць аб высокай якасці адукацыі.

— Удзел у іх дае разуменне, якія працэсы ва ўніверсітэце неабходна развіваць. Рэйтынг SIR паказвае наяўнасць навуковых кампетэнцый. Дарэчы, у яго ад Беларусі ўваходзяць яшчэ БДУ і Нацыянальная акадэмія навук. І гэта пры тым, што мы не класічная, а тэхнічная ВНУ, у якой заўсёды менш шанцаў выйсці на першыя пазіцыі. У міжнародным рэйтынгу QS World University Ranking уваходзім у тысячу найлепшых універсітэтаў свету, у рэйтынгу QS World University Ranking: Emerging Europe and Central Asia займаем 103 месца, згодна з Webometrics — мы на 2562 пазіцыі, у рэйтынгу найлепшых тэхнічных універсітэтаў свету Worldwide Professional University Ranking — 298-ю пазіцыю. У нас актыўна развіваецца замежнае супрацоўніцтва і мы ўпэўнена адчуваем сябе на міжнародным рынку.

За сваю стагадовую гісторыю БНТУ ўнёс значны ўклад у развіццё краіны: з удзелам інжынераў ВНУ пабудаваны знакавыя архітэктурныя аб'екты, метро, узведзены адны з найлепшых дарог у Еўропе, створаны аўтамабілі і грамадскі транспарт ды іншае.

— Універсітэт заўсёды функцыянаваў паспяхова. Калі згадаць яго гісторыю, першапачаткова ён складаўся з пяці факультэтаў, мы рыхтавалі будаўнікоў і спецыялістаў у галіне машынабудавання. Названыя спецыяльнасці актуальныя і дагэтуль, і лічу, што будуць патрэбныя ў будучыні. У выніку гістарычных падзей, якія перажывала краіна, гісторыя ВНУ таксама няпростая. Грамадзянская вайна, Вялікая Айчынная вайна, індустрыялізацыя, пасляваеннае аднаўленне.



**Напярэдадні юбілею ўніверсітэта Сяргей Харытончык звярнуўся да ўсіх са святочнымі пажаданнямі:**

*— У наш юбілейны год усяму калектыву хочацца пажадаць моцнага здароўя і творчых поспехаў! Студэнтам — актыўнага засваення тых ведаў, якія даюць нашы выкладчыкі, бо сёння ў ВНУ створаны ўсе магчымасці, каб атрымаць якасную адукацыю, упэўнена адчуваць сябе на рынку працы. Па нашых выпускніках мы бачым, што вельмі шмат тых, хто не даюць сабе расслабіцца з першага курса, актыўна супрацоўнічаюць з будучымі работадаўцамі, і ўжо да выпуску становяцца прафесіяналамі. Зразумела, такія спецыялісты не застануцца без першага рабочага месца і дастойнай зарплаты. Нашым абітурыентам жадаю добра падумаць аб выбары прафесіі, узважыць свае жыццёвыя запыты і мэты. Мы са свайго боку будзем імкнуцца зрабіць з вас высокакваліфікаваных спецыялістаў.*

— Ужо ў XXI стагоддзі грамадства нечакана сутыкнулася з пандэміяй. Як яна паўплывала на навучанне ва ўніверсітэце?

— Мы адчулі яе подых на сабе, таму трэба было аператыўна перабудоўваць навучальны працэс у новы фармат. Нашаму Міжнароднаму інстытуту дыстанцыйнай адукацыі ў гэтым годзе споўнілася 20 гадоў. Мы даўно вялі работу па стварэнні электронных вучэбна-метадычных комплексаў, імі маглі карыстацца як завочнікі, так і студэнты дзённага аддзялення, каб удасканальваць свае веды. Да таго ж тэхнічную гатоўнасць да анлайн-заняткаў дапамагаюць забяспечыць камп'ютарныя класы. Іх у нашай ВНУ каля 120.

— Хутка ва ўніверсітэце пачнуцца святочныя дні, да юбілею ВНУ прымеркавана шмат цікавых мерапрыемстваў. Якія гэта будуць падзеі і ці будуць яны адаптаваныя да сітуацыі з каранавірусам?



— У такіх умовах сваю ўрачыстую праграму мы аптымізавалі, усе мерапрыемствы будуць суправаджацца мерамі эпідбяспекі. 7 снежня мы адкрыем шэраг выставак, у ліку якіх і музейныя экспазіцыі, што пройдуць у галоўным корпусе ўніверсітэта: гэта выстаўкі кітайскай культуры, дасягненняў Навукова-тэхналагічнага парку БНТУ «Палітэхнік», газеты «Савецкі інжынер — Весці БНТУ», творчых работ студэнтаў, навучэнцаў каледжаў. Таксама адкрыюцца дзевяць імянных лабараторый і кафедраў. 8 снежня запланавана адкрыццё Дошкі гонару ўніверсітэта, такая традыцыя закладваецца ў нас упершыню. Штогод мы будзем вызначаць найлепшых работнікаў і такім чынам іх адзначаць. У гэты ж дзень прэзентуем скульптурную кампазіцыю «Студэнты БНТУ». 9 снежня на пляцоўцы каля галоўнага ўвахода на тэрыторыю студгарадка завершыцца Эстафета юбілейнага агню, якая з першага верасня прайшла па шэрагу прадпрыемстваў краіны, дзе працуюць нашы выпускнікі. У гэты ж дзень можна наведаць выстаўку інавацыйнай прадукцыі прадпрыемстваў-заказчыкаў кадраў і скульптурную кампазіцыю «Крышталь ведаў», дзе будзе закладзена Капсула часу. 10 снежня пройдзе прыём дэлегацый, а таксама пасяджэнне Савета БНТУ. Завершыцца ўсё святочным салютам. 11 снежня — работа з афіцыйнымі дэлегацыямі, мяркуецца падпісанне шэрагу пагадненняў з беларускімі і замежнымі партнёрамі. Вядома, з-за эпідсітуацыі не ўсе змогуць наведаць свята, але мы хочам, каб кожны адчуў, што ў такую знакавую дату ніхто не забыты. Таму ўсе падзеі будуць транслявацца анлайн. Да таго ж у кожным падраздзяленні нашай ВНУ пройдуць свае ўрачыстыя мерапрыемствы, бо нашы факультэты можна параўнаць з самастойнымі інстытутамі, у некаторых з іх навучаюцца некалькі тысяч студэнтаў і за гады існавання ВНУ там сфармаваліся свае цікавыя традыцыі і атмасфера.

Дарэчы, ідэя залажэння Капсулы часу, падзяліўся Сяргей Васілевіч, паўстала нечакана, з мэтай перадаць новаму пакаленню думкі, эмоцыі, інжынерны дух сучаснасці.

— На ўрачыстай лінейцы першага верасня мы запрасілі ўсіх ахвотных сфармуляваць свае прапановы. Ад імя Савета ўніверсітэта таксама падрыхтавалі пасланне, каб перадаць яго будучым пакаленням, уклалі туды самыя цёплыя пажаданні. Плануем адкрыць гэтую капсулу праз 50 гадоў. Спадзяюся, што гэта стане своеасаблівай традыцыяй для ўніверсітэта, і праз 50, 100 гадоў нашы нашчадкі таксама пакінуць свой ліст. А вось узводзіць скульптуры каля ВНУ напярэдадні значных дат ужо традыцыя. З апошняга — памятны знак, прымеркаваны да 55-годдзя студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Менавіта нашы студэнты ў 1963 годзе аднымі з першых у краіне былі іх арганізатарамі. Сёлета цэнтральнай фігурай скульптуры сталі студэнты, яны ўвасабляюць маладосць, палёт думак, светасць творчых задум. Дзяўчына сімвалізуе спецыяльнасці, звязаныя з будаўніцтвам і архітэктурай, юнак — тэхнічныя спецыяльнасці. Гэтая група будзе ўпрыгожваць месца каля галоўнага корпуса. Таксама да нашага юбілею рыхтуем чарговае выданне гістарычнага нарыса аб ВНУ, дзе будуць змешчаны малавядомыя факты пра ўніверсітэт, рэктараў і выкладчыкаў, факультэты і іншае, цікавыя фатаграфіі папярэдніх гадоў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 100354447.




**Капсула часу перадасць у 2070 год пасланне ад сённяшніх студэнтаў і супрацоўнікаў БНТУ. Пасланне такі ліст мае магчымасць кожны, збор допісаў арганізаваны ў фае галоўнага корпуса.**




**У музеі гісторыі БНТУ захоўваецца мноства каштоўных дакументаў і экспанатаў, якія расказваюць аб мінулым гэтай ВНУ. Асобнае прыкметнае месца ў экспазіцыі адведзена дакументам пра тых, хто ў часы ваеннага ліхалецця змагаўся за свабоду і незалежнасць краіны.**

# САМЫ НАРОДНЫ ПРАДУКТ

## Даведаліся пра цэны на сала ў гіпермаркеце, на сталічным рынку, у фермерскім аддзеле крамы і на міні-рынку прыдарожнага гандлю

**З надыходам халадоў традыцыйна хочацца салёнага сальца — з чорным хлябком, часнаком або цыбуляй, гарчыцай ці хрэнам. Без сала цяжка ўявіць зімовы рацыён жыхароў славянскіх краін. Хоць радзімай класічнага салёнага сала ў сучасным разуменні гісторыкі называюць... Італію. Зрэшты, сам спосаб неверагодна стары — сала салілі яшчэ ў Старажытным Кітаі!**

У Беларусі салёнае сала ўваходзіць у незлічоную колькасць рэцэптаў — ад дамашніх каўбас да гарачага, гарніраў, супоў і нават салатаў. На ім пякуць, з ім тушаць і запякаюць. Сала — тая страва, дзе неверагодна ярка выяўляюцца нацыянальныя смакавыя перавагі. Напрыклад, у Беларусі любяць саліць сала з часнаком, у Венгрыі — з чырвоным перцам, а ў Эстоніі ўвогуле сала звычайна вэндзяць... Такім чынам, адпраўляемся купляць сала...

### НА КАМАРОЎЦЫ

На самым вядомым рынку сталіцы на прылаўках, што пачынаюцца каля прыступак цэнтральнага ўвахода ў крыты павільён, сала прадстаўлена ў шырокім асартыменце. Снежна-белае ці ружаватае, таўшчынёй прыкладна 10 см, з тонкай скуркай — у сярэднім 15,90-15,99 за кіло. Сала з мяснымі праслойкамі — грудзінка, саланіна або карэйка абыдзецца танней, каля 14,99 за кілаграм. Усім, хто спыняецца каля прылаўка, абавязкова прапануюць пакаштаваць: адрэжуць па тонкім, празрыстым кавалачку розных відаў сала і мясных прадуктаў. «Па жаданні кліента» натруць упадабаны кавалак сала часнаком і пасыплюць кменам. У многіх прадаўцоў ёсць пастаянныя пакупнікі. Гандляры памятаюць, што даспадобы пастаянным кліентам, і імкнуцца прапанаваць найлепшае.

Падыходжу да гандляроў з Брэста.

***— Чаму ў вас сала з мяснымі праслойкамі таннейшае за звычайнае белае?***

— Сала цяпер цэніцца больш, чым мяса, — адказвае гаваркая пажылая гандлярка. — Раней мяса лічылася даражэйшым. Я сама ў маладосці з вёскі, ад бацькоў, свіныя кумпякі на плячах у Мінск вазіла, а ў наш час трэба мяса і сала не з вёскі, а ў вёску вазіць. Свіней цяпер у вёсках не трымаюць, не тое што раней. Старым цяжка, моладзь раз'ехалася. А калі хто застаўся і працуе, напрыклад, на свінакомплексе, ім не дазваляюць дома парасят трымаць. Пакаштуйце сала! — без пераходу, літаральна на адным дыханні, вяртае размову ў практычнае рэчышча мая суразмоўніца. — Сала проста шыкоўнае. А грудзінку аддам па 13,90.

***— А колькі сала ў дзень прадаяце? Пяць кілаграмаў, дзесяць?***

— Вы што, смеяцеся — пяцьдзесяць? Адзін пакупнік можа ўзяць пяць кілаграм. Мы толькі на сале цяпер касу і робім.

Сала заўсёды зімой станавілася прадуктам нумар адзін, але цяпер у сувязі з ковідам яно на піку папулярнасці, распавядае іншая дзяўчына-прадавец. Сала, якім яна гандлюе, «прыехала» ў Мінск з Гродзенскай вобласці.

— Для імунітэту, ачышчэння каранёў бронхаў, для аднаўлення лёгачнай тканкі трэба есці сала абавязкова — хоць бы 40 грамаў у суткі, — кажа суразмоўніца.

На «сальных» радах на Камароўцы можна вывучаць геаграфію Беларусі — тут прадстаўлены «самы народны прадукт» з многіх рэгіёнаў краіны. Паходжанне сала — у асноўным фермерскія гаспадаркі.

— Смачнае салёнае сала трэба купляць менавіта на рынку, тут яно сапраўднае, вясковае, — кажа Наталля, яна гандлюе салам са Стаўбцоўскага раёна. — Самае мяккае і далікатнае сала — са спіны, яно будзе рэзацца «як масла». Бачок будзе больш жорсткі. У грудзінцы шмат мяса, яна цвердаватая — на аматара.



Наогул, чым большая таўшчыня сала, тым яно мякчэйшае, расказалі мне. Важны і колер. Сала павінна быць белае. Пачырваненні на сале непажаданыя. Жаўтлявае або шараватае адценне — прыкмета таго, што сала старое.

— Сала цяпер — самы хадавы прадукт, — расказвае прадавец, што гандлюе салам з Ашмянаў. — У дзень 25 кілаграмаў прадаём.

***— Нягледзячы на кошт?***

— А што, вараная каўбаса па 10 рублёў кілаграм — больш карысная? На самай справе, сала — досыць эканамічны прадукт. Яно каларыйнае. Нарэзаў, паеў — і сыты. А многія прадукты з'еў — і праз пяць хвілін зноў есці хочацца.

Некалькі гадоў таму гаспадыні, што прыходзілі на Камароўку, ведалі: чым бліжэй да цэнтральнай часткі павільёна, тым таннейшыя мясныя прысмакі (у тым ліку сала). Але цяпер разбежкі цэн практычна няма. Тонкае таннейшае, тоўстае — даражэйшае. Выбар за пакупніком.

Сала з Дзяржынскага раёна, якім гандлюе малады мужчына — адно з самых дарагіх на рынку. У яго на прылаўку сала сапраўды вельмі прыгожае — нават не каштуючы, бачыш, якое яно мяккае. Прадавец гаворыць, што гэта менавіта дамашняе сала, не «калгаснае» і нават не фермерскае. Ездзіць па вёсках, скупляе сала і мяса ў народа — у тых сялян, хто гадуе свіней, і сам прадае на рынку. Сала — па 16,90 за кілаграм, а, напрыклад, сыравяленыя балыкі — аж па 35 рублёў.

***— Нятанна!***

— Жыццё такое сёння, — адгукаецца прадавец. — А наогул, цана на сала і мяса ў нас не мянялася ўжо два гады. Так што дорага, але людзі купляюць. Рэшткі бываюць па зніжках, па 10.90. Але добрае сала як каштавала, так і каштуе.

Дарэчы, па словах знаўцы, «самы супер» — гэта дамашняе сала «з ружовінкай». З такой няўлоўнай, пяшчотнай «ружовінкай», якая бачная толькі пры добрым асвятленні, — калі не прыглядацца, сала здаецца проста белым.

Перад Новым годам салёнае сала наўрад ці патаннее, расказалі мне на «Камароўцы». А вось свежае, несалёнае — цалкам верагодна, у перадсвяточныя дні трохі ўпадзе ў цане. Да застолля купляюць свежае мяса ці мясную «смакату», а на свежае сала попыт падае. Так што калі хочаце набыць сала на засолку танней, ідзіце па яго на рынак пад Новы год.

### У ГІПЕРМАРКЕЦЕ І ФЕРМЕРСКІМ АДДЗЕЛЕ

У каўбасным аддзеле сеткавага гіпермаркета досыць шмат варыянтаў салёных прадуктаў са свініны, ёсць «грудзінка па-сялянску» і «саланіна з кумпяка», але класічнага белага салёнага сала няма.

— Часам бывае, — кажа прадаўшчыца. — Але рэдка.

Грудзінка розных відаў каштуе ў сярэднім дзевяць рублёў з капейкамі, саланіна па-дамашняму — чыстае мяса без усялякага сала — 18 рублёў. Але гэта ўсё не тое, гэта ўсё міма! Мы ж хочам звычайнага, класічнага белага сала.

Ідзём у фермерскі аддзел. Тут сала ёсць, ура! Класічнае белае (яно называецца «Шпик хребтовой»), некаторыя кавалачкі — з тонкай праслоечкай мяса — каштуюць 14 рублёў 29 капеек. Грудзінка — 15,59, салёная шыя — 16,59. Ёсць паляндвіца і выразка. Тут таксама можна пакаштаваць прысмакі і распытаць аб паходжанні прадукту.

— Сала з Дзяржынска, фермерская гаспадарка, — ахвотна расказвае прадаўшчыца і дадае, што фермерскія прадукты пакупнікі не абыходзяць бокам. Напрыклад, добра бяруць каўбасы, мясныя саленні і тое ж сала.

### НА ПРЫДАРОЖНЫМ МІНІ-РЫНКУ

Лічыцца, што ў сталіцы жыццё даражэйшае, чым у рэгіёнах. Можа быць, па сала варта адправіцца на прыдарожныя рынкі — думаецца, вясковы прадукт нумар адзін там павінен быць таннейшы. Пракладзенай сцежкай накіроўваемся на прыдарожны рыначак у вёсцы Краснае, на Маладзечанскай трасе. Дарэчы, дарогу сюды ўжо праклалі многія мінчане — гэта адзін з самых буйных прыдарожных міні-рыначкаў паблізу ад Мінска.

— Сальца па пятнаццаць. Вельмі мяккае, ёсць і з мяскам. Каўбаска пальцам пханая ёсць, — прапануе свой тавар мясцовая пенсіянерка. — Можаце апрацаваць рукі антысептыкам — ён у мяне спецыяльна для гэтай мэты тут стаіць — і пакаштаваць.

Свіней яна трымае сама.

— Мы яшчэ працаздольныя. Гэта сучасная моладзь хоча ўсё гатовае адразу купіць у краме. А хіба ж у краме такое сала купіш?

Даведалася я, і ад чаго залежыць смак сала. Аказваецца, самае смачнае сала атрымліваецца, калі ў ежу свінчу дадаваць жалуды. Мяккае, амаль як масла, сала будзе, калі дадаваць у корм кукурузу. А наогул вясковае сала лепш за магазіннае, таму што сваіх свінак кормяць толькі натуральнымі прадуктамі, «ніякай хіміі». Дарэчы, бабулі, якія гандлююць салам на прыдарожных рыначках, гавораць (а яны ведаюць, што кажуць!), што сапраўднае сала павінна быць таўшчынёй не менш за пяць сантыметраў, таўшчыня скуркі — да чатырох міліметраў. Купляючы сала для засолкі, яго варта панюхаць: старонніх пахаў быць не павінна. Не варта браць сала з грудзіны, яно будзе цвердаватае. Ідэальны выбар — сала з кумпяка, лапаткі або хрыбта. І, само сабою, тут мне таксама расказалі, што сала падтрымлівае імунітэт, і таму яго трэба есці менавіта ў перыяд разгулу вірусных захворванняў.

У сярэднім, сала на пунктах прыдарожнага гандлю каштуе 15— 17 рублёў за кілаграм — не танней, чым на Камароўцы. Затое — яно самае што ні на ёсць аўтэнтычнае. Прадаўцы кажуць, практычна ў кожнага ёсць пастаянныя пакупнікі, бо прадукт у гаспадароў сезонны і хутка заканчваецца. У набыцці сала на падобных міні-рыначках ёсць адзін мінус — сала (як і тая ж пальцам пханая каўбаска, і іншыя «смачнасці») не праходзіць ніякага санітарна-гігіенічнага кантролю. Тэарэтычна, можна атруціцца. Зрэшты, прадаўцы кажуць, што соляць сала для сваёй сям'і і на продаж аднолькава, і для адных, і для другіх мэт літаральна рэжуць яго з аднаго кавалка. І пакуль, маўляў, ніхто не скардзіўся.

### ЧАРКА І СКВАРКА

Сёння дыетолагі з павагай гавораць пра сала. Справа ў тым, што класічнае вясковае белае сала змяшчае ўнікальны кампанент — арахідонавую кіслату, якая яшчэ сустракаецца толькі ў аліўкавым і арахісавым алеяў. Гэтая кіслата — будаўнічы матэрыял для клетак чалавечага арганізма. Яна патрэбна літаральна для ўсіх яго біяхімічных працэсаў. Яе нават называюць «каралевай тлустых кіслот», таму сала можа быць вельмі карыснае, але «ў невялікіх дозах».

Ужываючы сала правільна, мы ўмацоўваем косткі, робім мацнейшымі пазногці і валасы, дапамагаем гаенню ран і траўмаў. Акрамя таго, сала змяшчае цэлы спектр біялагічна актыўных рэчываў: тлушчараствальныя вітаміны (A, D, E, F), а яшчэ — вітаміны групы B, якія ратуюць нас зімой ад дэпрэсіі. Дарэчы, сала значна карыснейшае за масла.

Пры гэтым важна памятаць, што сала — гэта тлушч у чыстым выглядзе. Таму ў вялікай колькасці яно негатыўна ўплывае на печань, а таксама на сардэчнасасудзістую сістэму. І, зразумела, пры перяданні прыводзіць да набору вагі. Даросламу чалавеку ў дзень сучасная дыеталогія рэкамендуе ўжываць каля 30 г гэтага прадукту.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.**

### Дарэчы, у тэму — рэцэпт сала «Фермерскае»: так бы мовіць, з першых вуснаў

*3 кг сала з мяснай праслойкай;*
*10 ст. л. солі;*
*1 ст. л. сумесі перцаў;*
*10 лаўровых лісточкаў;*
*1 галоўка часнаку;*
*40 г прыправы для шашлыку;*
*па маленькім пучку зеляніны кропу і пятрушкі.*

Сала спалоскваем прахалоднай вадой, прамокваем, наразаем на невялікія кавалачкі.

Для падрыхтоўкі сумесі спецый злучаем соль, прыправу для шашлыку, сумесь перцаў, лаўровы ліст (яго трэба загадзя паламаць).

Здрабняем зеляніну пятрушкі і кропу, часнок наразаем пласцінкамі.

На дно эмаліраванай каструлі насыпаем сумесь спецый, зеляніну, часнок. Кожны кавалачак сала з усіх бакоў націраем сумессю спецый.

Пасля таго як у посуд будзе выкладзены першы слой сала, шчодра пасыпаем яго зелянінай і пласцінкамі часнаку. Укладваем сала да верху каструлі. Зверху высыпаем астатнюю сумесь спецый.

Накрываем каструлю крышкай і ставім у халадзільнік на тыдзень.

## ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества ОАО «Дятловоремстрой» (УНП 500056186), объявляет о проведении **12.01.2021 г. в 10.00** публичных торгов в форме аукциона по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, ком. 501

**Предметы торгов**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Сумма шага аукциона: 5 % от начальной стоимости предмета торгов, бел. руб. с НДС | Размер задатка: 5 % от начальной стоимости предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | АККУМУЛЯТОРНЫЙ ШУРУПОВЕРТ GSR 12-2 | 30,00 | 1,50 | 1,50 |
| 2 | БЕНЗОПИЛА MS | 150,00 | 7,50 | 7,50 |
| 3 | БЕНЗОПИЛА MS | 150,00 | 7,50 | 7,50 |
| 4 | БЕНЗОПИЛА STIHL MS 361 | 450,00 | 22,50 | 22,50 |
| 5 | БЕНЗОРЕЗ SNIHT TS400 | 90,00 | 4,50 | 4,50 |
| 6 | БЕНЗОРЕЗ TS410 | 605,00 | 30,25 | 30,25 |
| 7 | БЫТОВКА (ОТ ЛАЗЮК) | 255,00 | 12,75 | 12,75 |
| 8 | ВИБРОПЛИТА | 600,00 | 30,00 | 30,00 |
| 9 | ВИБРОПЛИТА RB45-2 | 600,00 | 30,00 | 30,00 |
| 10 | ЕМКОСТЬ ПОД БЕНЗИН | 350,00 | 17,50 | 17,50 |
| 11 | ИЗМЕРИТЕЛЬ ВЛАЖНОСТИ | 180,00 | 9,00 | 9,00 |
| 12 | КОМПРЕССОР СО7 | 420,00 | 21,00 | 21,00 |
| 13 | КОМПЬЮТЕР | 75,00 | 3,75 | 3,75 |
| 14 | КОМПЬЮТЕР | 75,00 | 3,75 | 3,75 |
| 15 | КОМПЬЮТЕР | 93,00 | 4,65 | 4,65 |
| 16 | КОМПЬЮТЕР | 75,00 | 3,75 | 3,75 |
| 17 | КОНСТРУКЦИЯ ДЛЯ УСТАНОВКИ НАВЕСНОГО ОБОРУДОВАНИЯ | 1580,00 | 79,00 | 79,00 |
| 18 | КОПИРОВАЛЬНЫЙ АППАРАТ | 100,00 | 5,00 | 5,00 |
| 19 | КРАН-БАЛКА | 3000,00 | 150,00 | 150,00 |
| 20 | КРАН-БАЛКА | 3000,00 | 150,00 | 150,00 |
| 21 | ЛЕСОРАМА С ТЕЛЕЖКОЙ | 1633,00 | 81,65 | 81,65 |
| 22 | ОТБОЙНЫЙ МОЛОТОК | 23,00 | 1,15 | 1,15 |
| 23 | ПЕРФОРАТОР | 130,00 | 6,50 | 6,50 |
| 24 | ПЕРФОРАТОР | 130,00 | 6,50 | 6,50 |
| 25 | ПЕРФОРАТОР GBH-4-32 DFR | 130,00 | 6,50 | 6,50 |
| 26 | ПИЛА МАЯТНИКОВАЯ | 92,00 | 4,60 | 4,60 |
| 27 | ПОДЪЕМНИК С ЭЛЕКТРИЧЕСКОЙ ЛЕБЕДКОЙ | 220,00 | 11,00 | 11,00 |
| 28 | ПОЛУАВТОМАТ СВАРОЧНЫЙ | 400,00 | 20,00 | 20,00 |
| 29 | ПРИСПОСОБЛЕНИЕ ДЛЯ ЗАТОЧКИ РАМНЫХ ПИЛ ЗП-1 | 717,00 | 35,85 | 35,85 |
| 30 | ПУСКОЗАРЯДНОЕ УСТРОЙСТВО | 480,00 | 24,00 | 24,00 |
| 31 | СИГНАЛИЗАЦИЯ (КОНТОРА) | 1192,00 | 59,60 | 59,60 |
| 32 | СТАНОК ЗАТОЧНЫЙ | 300,00 | 15,00 | 15,00 |
| 33 | СТАНОК ЛЕНТОЧНЫЙ | 1250,00 | 62,50 | 62,50 |
| 34 | СТАНОК РЕЙСЛУСНЫЙ СР4-1 | 1450,00 | 72,50 | 72,50 |
| 35 | СТАНОК С-25-4 | 2245,00 | 112,25 | 112,25 |
| 36 | СТАНОК СВЕРЛИЛЬНЫЙ | 117,00 | 5,85 | 5,85 |
| 37 | СТАНОК СПГ-16 ДОЛБ. | 918,00 | 45,90 | 45,90 |
| 38 | СТАНОК ТОРЦОВЫЙ | 147,00 | 7,35 | 7,35 |
| 39 | СТАНОК УНИВЕРСАЛЬНО ЗАТОЧНЫЙ 304 | 935,00 | 46,75 | 46,75 |
| 40 | СТАНОК ФРЕЗЕРНЫЙ ФС | 600,00 | 30,00 | 30,00 |
| 41 | СТАНОК ФРЕЗЕРНЫЙ ФСШ-1 | 899,00 | 44,95 | 44,95 |
| 42 | СТАНОК ЦДК-5-2 | 1436,00 | 71,80 | 71,80 |
| 43 | СТАНОК ЦИРКУЛЯРНЫЙ ЦА-121 | 478,00 | 23,90 | 23,90 |
| 44 | СТАНОК ШЛПС-6 | 800,00 | 40,00 | 40,00 |
| 45 | ЭЛЕКТРОСТАНЦИЯ | 600,00 | 30,00 | 30,00 |

**Местонахождение имущества:** г. Дятлово, ул. Советская, д. 73.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

**Продавец:** ОАО «Дятловоремстрой», тел. +375293923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, ком. 501; тел. +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **11.01.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 07.12.20** по **17.00 11.01.21** по адресу: г. Минск, ул. Гурского д. 22б, ком. 501. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов. Оформление результатов торгов в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов составили: 240,00 бел. руб. за объявление, аукционный сбор – 7 % от конечной цены предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение тридцати рабочих дней со дня проведения аукциона.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

## Продавец – ОАО «ОРС Гомель». Оператор – «Единая система электронных торгов» torgi.gov.by

**Предмет электронных торгов и его месторасположение**

**Лот № 1**. Изолированное помещение, инв. № 350/D-357559, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 97/4-107, общая площадь 496,9 кв. м (назначение: торговое помещение). (Договор аренды на банкомат № 2/582 от 30.04.2019).

**Лоту принадлежит оборудование:**
кондиционер Ballu BCFB, инв. № 346181; кондиционер ASH 30R/AOH-302, инв. № 416111; кондиционер SH 30R/AOH-302, инв. № 416109; система охранной сигнализации, инв. № 347249; система видеонаблюдения, инв. № 346204; система пожарной сигнализации, инв. № 346205; холодильная камера КХН -4SP, инв. № 43779; холодильная камера КХН -4SP, инв. № 43780.

**Информация о земельном участке**: кадастровый номер 340100000001001120, площадью 0,2642 га, (доля в праве 73/1000). Договор аренды на земельный участок № 3622 от 31.03.2008 г.

**Начальная стоимость с НДС 20 % – 934 742,09 руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости 93 474,21 руб.**

**Лот № 2.** Капитальное строение здание ресторана с подвалом, инв. № 320/С-19142, расположенное по адресу: г. Жлобин, пл. Привокзальная, общая площадь 1158,2 кв. м, (назначение: здание специализированное общественного питания); а/б покрытие, инв. № 100211.

**Лоту принадлежит оборудование:**
кондиционер ASW-H24BAHSA, инв. № 100405; кондиционер ASW-H24BAHSA, инв. № 100416; кондиционер LG LV-H488LLAO, инв. № 101150, система охранной сигнализации, инв. № 101138; рекламная вывеска «Ресторан», инв. № 5501; фонари уличные (10 шт.), инв. № 10060-100609; люстра в банкетном зале, инв. № 100501; теплосчетчики (2 шт.), инв. № 100711-100712.

Недвижимое имущество обременено залогом банка.

**Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100002001016 площадью 0,1626 га, право постоянного пользования, назначение – для обслуживания здания ресторана.

**Начальная стоимость с НДС 20 % – 1 449 271,01 руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости 144 927,10 руб.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение, инв. № 320/D-21745, **расположенное по адресу: г. Жлобин, ул. Баталова, 8, пом. 1А**, инв. № 320/D-21745, общая площадь 82,8 кв. м, (назначение: административное помещение).

**Информация о земельном участке:** объект расположены на земельном участке с кадастровым номером 321850100002001017, площадью доля в праве 2/25 (договор аренды на земельный участок № 3159 от 26.10.2016).

**Начальная стоимость с НДС 20 % – 92 721,41 руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости 9 272,14 руб.**

**Лот № 4.** Капитальное строение здание бара «Экспресс», **расположенное по адресу: г. Калинковичи, ул. Октябрькая, 30Б,** инв. № 333/С-41363, общая площадь 61,2 кв. м, (назначение здание специализированное общественного питания).

**Лоту принадлежит:**
навес бара «Экспресс», инв. № 410068; кондиционер Galanz GU-36-HRST/AU, инв. № 449038.

**Информация о земельном участке:** объект расположены на земельном участке с кадастровым номером 322350100002000171 площадью 0,0418 га, право постоянного пользования, назначение – для обслуживания здания.

**Начальная стоимость с НДС 20 % – 37 582,37 руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости 3 758,24 руб.**

**1. Электронные торги состоятся 05.01.2021 на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by.**
2. Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», размещенным на сайте: torgi.gov.by
3. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
4. Последний день подачи заявлений – 04.01.2021.
5. Шаг аукциона 5 % от начальной цены предмета торгов.
6. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат согласно прейскуранта торговой площадки в течение пяти календарных дней со дня проведения торгов.
7. После совершения победителем торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов с продавцом заключается договор купли-продажи имущества.
8. Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. +37529 6672143.

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### на право заключения договора аренды земельного участка для установки торгового павильона в агрогородке Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63А, Березинского района Минской области

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **11 января 2021 года, в 9.00** (Минская область, г. Березино, ул. Октябрьская, д. 18) Березинский районный исполнительный комитет, малый зал заседаний |
| **Продавец и его адрес** | Березинский районный исполнительный комитет, Минская область, г. Березино, ул. Октябрьская, д. 18 |
| **Земельный участок (количество), размер, его кадастровый номер и адрес** | Лот 1 – один участок площадью 0,0021 га, № 620480800601000227, Минская обл., Березинский р-н, Богушевичский с/с, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63А |
| **Целевое назначение земельного участка** | Для размещения объектов розничной торговли (для установки торгового павильона) |
| **Начальная цена права заключения договора аренды** | 51 копейка |

**С дополнительной информацией можно ознакомится в извещении** о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельного участка размещенное на официальных сайтах: Березинского районного исполнительного комитета (berezino.minsk-region.gov.by), Минского областного исполнительного комитета (minsk-region.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (au.nca.by).

### Уважаемые акционеры

## ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»!

### 23 декабря 2020 года в 10.00

**состоится внеочередное общее собрание акционеров Общества.**

**Место проведения собрания: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, административное здание Общества, 2-й этаж, актовый зал**

**Повестка дня:**
1. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 5-й этаж, кабинет службы менеджмента качества с 16 по 22 декабря 2020 г. с 10.00 до 17.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00) либо 23 декабря 2020 года – по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания состоится с 09.45 до 09.55 по месту проведения собрания.

При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров будет сформирован по состоянию на 01.12.2020 года.

**Наблюдательный совет (80174261754)**

УНП 600122771

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 1.3 по генплану. 1-я очередь строительства»

**Информация о застройщике:**

**Открытое акционерное общество «БелАТЭП» (ОАО «БелАТЭП»)**

Место нахождения: 220033, г. Минск, ул. Стрелковая, д.14. Режим работы: понедельник — пятница с 9.00 до 17.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни — суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация застройщика:** Открытое акционерное общество «БелАТЭП», зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 10 июля 2000 года, № 100104554.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, ОАО «БелАТЭП» участие не принимало.

**Информация об объекте строительства**

**Цель строительства:** строительство объекта недвижимости «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 1.3 по генплану. 1-я очередь строительства.

**Этапы и сроки реализации строительства:** начало строительства — 15 июня 2020 года, завершение строительства — 31.08.2021г.

